БА9410

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок нанпарэлі насярод тэксту	1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 276 (2464) Субота, 1-га сьнежня 1928 г.

Рэзалюцыя Аб'яднанага Пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б

па дакладу тав. Гамарніка аб рабоце лістападаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б).

(Прынята аднагалосна 30-XI-28 г.).

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК Камуністычнае Партыі Беларусі, заслухаўшы даклад тав. Гамарніка аб рабоце ПленумуЦК УсеКП(б) цалкам і поўнасьцю ўхваляе яго рашэньні, якія знаходзяцца ў поўнай адпаведнасьці з генэральнай лініяй 15-га партзьезду і правідлова ўвязваючыя бягучыя задачы з агульнымі доўгатэрміновымі задачамі і мэтамі партыі ў справе будаўніцтва і пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

У кантрольных лічбах народнай гаспадаркі на 1928-29 г. знайшла сваё выразнае яскравае адбіцьцё гэнеральная лінія партыі на шпаркі, напружаны, праводзімы ўсімі сіламі рабочае дзяржавы, тэмп індустрыялізацыі краіны, тэмп вызначаемы як нашым міжнародным становішчам, высоўваючым з асаблівай вастратой перад намі задачу ў максымальна магчыма карацейшы гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны, як у тэхнічна-эканамічных адносінах, так і ўнутраным становішчам, становішчам нашай прамысловасьці, задачамі рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі, у тым ліку і сельскае, на базе новай высокай тэхнікі. Зусім правільна Пленум адзначае, што: «рэвалюцыянізуючы ўплыў на сельскую гаспадарку пралетарыят зможа зьдзейсьніць толькі пры хуткім тэмпе разьвіцьця індустрыі і далейшым узмацненьні вядучай і перэтвараючай ролі сацыялістычнай прамысловасьці». У гэтых адносінах цяжкая індустрыя і вытворчасьць сродкаў вытворчасьці зьяўляецца грунтоўнай крыніцай сацыялістычнага пэратварэньня ўсяе народнае гаспадаркі, у тым ліку і сельскае. Менавіта, вытворчасьць сродкаў вытворчасьці і разьвіцьцё цяжкай прамысловасьці зьяўляецца выходным пунктам індустрыялізацыі краіны. Рэзалюцыя па кантрольных лічбах адначасова правідлова адзначае, што: «сялянская гаспадарка ёсьць база прамысловасьці і яе ўзрост ёсьць узрост харчовай і сыравіннай базы індустрыі» і што мы маем у наяўнасьці непамернае адставаньне тэмпу разьвіцьця сельскай гаспадаркі ад патрэб і задач індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнага ўздыму,—з усёй сілай завострвае ўвагу ўсёй партыі на рашучым уздыме сельскай гаспадаркі, на каранной рэканструкцыі яе па лініі далейшага ўсямернага будаўніцтва калгасаў і саўгасаў і адначасова усямернага стымуляваньня ўздыму індывідуальнай бядняцкай і серадняцкай сялянскай гаспадаркі. Пленум з усёй рашучасьцю адхіляе неправідловае панічнае ўцьвярджэньне аб «застою», аб «дэградацыі» сялянскай гаспадаркі.

Пленум у поўнай адпаведнасьці з думкай усёй партыі, выказанай у папярэдняй перад Пленумам пераклічцы ўсіх партарганізацый па пытаньню аб правай небясьпецы, аб барацьбе супроць правага ўхілу і прымірэнцтва з ім, правільна вызначыў задачу партыі, як задачу барацьбы на два фронты супроць адкрыта правага апартуністычнага ўхілу і супроць „левага“ трацкісцкага, супроць прымірэнцтва ў адносінах да ўхілаў ад правільнай бальшавіцкай лініі. Зусім правідлова лічачы, што абодвы ўхілы павінны сустрэць рашучы адпор партыі, Пленум адначасна выходзячы з таго, што правая небясьпека зьяўляецца ў сучасны момант галоўнай небясьпекай, мабілізуе ўвагу партыі, галоўным чынам, на барацьбу з правым ухілам.

Пленум ЦК правільна ўвязаў грандыёзную задачу рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі Савецкага Саюзу на сучасным этапе з пытаньнем аб рэгуляваньні росту партыі, з задачамі далейшага рашучага арабочваньня партыі за лік рабочых, занятых у вытворчасьці, з чысткаю і аднаўленьнем партыі. Новыя гіганцкія задачы будаўніцтва сацыялізм, рашучага наступленьня на клясавага ворага патрабуюць ачышчэньня радоў партыі ад усяго гнілога, чужога, варожага, ад папутчыкаў, ад бюракратаў патрабуюць уцягненьня ў партыю новых і новых рабочых, батракоў, сялян-беднякоў, калгасьнікаў з тым, каб дабіцца да канца 1930 году наяўнасьці ў партыі ня менш паловы ўсяго складу рабочых з вытворчасьці. Чым хутчэй партыя ачысьціцца ад усяго гнілога, небальшавіцкага і папоўніцца новымі рабочымі, тым лепш яна будзе спраўляцца з усімі стаячымі перад ёй задачамі сацыялістычнага будаўніцтва на новым этапе, тым лепш яна будзе перамагаць ухілы ад ленінскай лініі

Аб'яднаны Пленум ЦК і ЦКК Камуністычнае партыі Беларусі, выходзячы з рашэньняў Пленуму ЦК УсеКП(б), высоўвае перад Кампартыяй Беларусі наступныя важнейшыя задачы:

1) Улічваючы нязначную ўдзельную вагу фабрычна-заводзкай прамысловасьці ў народнай гаспадарцы Беларусі і яе тэхнічную адсталасьць, а таксама ўлічваючы наяўнасьць шматлікай вольнай рабочай сілы і неабходнасьць узмацненьня пралетарскай базы ў БССР, лічыць неабходным усямернае павышэньне ўдзельнае вагі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР.

Разьвіцьцё прамысловасьці павінна ісьці, галоўным чынам, па лініі ўсё большага і дальнейшага скарыстаньня мясцовае сельскагаспадарчае, лясное і мінэральнае сыравіны, а таксама разьвіцьця прадпрыёмстваў па індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі. Паколькі рэсурсы сыравіны ў БССР не забясьпечваюць неабходнага тэмпу разьвіцьця яе прамысловасьці,—павінна быць удзелена дастатковая ўвага да пабудовы ў БССР прадпрыёмстваў, грунтуючыся на прывознай, вытрымліваючай перавозку, сыравіне і поўфабрыкатах. Адначасова, прымаючы пад увагу значную ролю дробнай саматужнай вытворчасьці ў Беларусі, неабходна выразна выконваць дырэктыву Пленуму ЦК УсеКП(б)—«забясьпечыць садзейнічаньне разьвіцьцю саматужнай прамысловасьці, рамества і г. д. і папярэдзіць усякую магчымасьць адміністрацыйных прасьледваньняў іх», усямерна разгортваючы кустпрамкаапэрацыю і дапамагаючы ёй.

2) Ставячы перад КП(б)Б першаступеннай важнасьці задачу ўсямернага ўздыму сельскае гаспадаркі, у прыватнасьці пашырэньне базы сыравіны, прымаючы пад увагу вострае малазямельле, вялікі процант маламоцных гаспадарак, аграрную перанаселенасьць, нізкую ўраджайнасьць, нізкую таварнасьць,—неабходна з усёй вастратой паставіць пытаньне аб калектывізацыі, як рашаючым асноўным шляху ўздыму і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, уздыму маламоцнай і серадняцкай гаспадаркі: неабходна якасна значна ўзьняць існуючыя саўгасы і прыняць усе магчымыя меры па будаўніцтву новых, адначасна неабходна ўсямернае стымуляваньне росту індывідуальнай бядняцка-серадняцкай сялянскай гаспадаркі. Пытаньні земляўпарадкаваньня, мэліярацыі, падняцьця ўраджайнасьці, аграноміі, павінны быць у цэнтры ўвагі партыі. Усе гэтыя задачы ў вёсцы могуць быць вырашаны і вырашаны па-бальшавіцку правільна толькі пры ўмове правільнай клясавай лініі працы, пры правядзеньні выразнай лініі апоры на беднату, моцнага саюзу з серадняком і рашучай барацьбы супроць кулака. Праца сярод беднаты штодзённая плянавая, палітычная, эканамічная і культурная, гэта—аснова ўсёй нашай работы ў вёсцы, наша грунтоўная задача

3) Барацьба ўнутры ўсёй партыі на два фронты супроць ухілаў і, ў першую чаргу, супроць правага ўхілу, набывае ва ўмовах Беларусі асобнае значэньне пры нязначнай праслойцы пралетарыяту ў рэспубліцы, шматнацыянальным складзе, прымежнасьці раёну, што ўзмацняе дробна-буржуазныя хістаньні, што ў сваю чаргу ў большай ступені, чым у інш. раёнах, цісьне на партыю, пралетарскі асяродак у якой малы, а асабліва фабрычна-заводзкіх рабочых. Загэтым уся КП(б)Б павінна быць асабліва на варце ў барацьбе супроць ухілаў, а ў сучасны момант асабліва ў барацьбе супроць найбольш небясьпечнага правага ўхілу і прымірэнцкіх да яго адносін, не паслабляючы барацьбы супроць трацкізму. Сьмелая, рашучая масавая самакрытыка, разгорнутая ўнутрыпартыйная дэмакратыя, разгорнутая партыйна-выхаваўчая, культурная праца—вось асноўныя мэтады выхаваньня партыйных мас, мабілізацыі іх на барацьбу з ухіламі і прымірэнцтвам з імі.

4) У сувязі з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва, вызначанымі Пленумам ЦК УсеКП(б), абвастрыўшайся клясавай барацьбой, узмацненьнем супраціўленьня клясавага ворага на ўсіх франтох, у тым ліку і ў правядзеньні намі нацыянальнай палітыкі узмацненьнем унутры партыі правай небясьпекі, неабходна мабілізаваць увагу партыі на пытаньнях правільнага бальшавіцкага правядзеньня нацпалітыкі. Неабходна са ўсёй рашучасьцю праводзіць далейшую беларусізацыю партыі, савецкага апарату і прафсаюзаў выходзячы з лініі партыі, што культура павінна быць нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце. Патрэбна ўсямерна разьвіваць нацыянальную форму, адначасна пільна сачыць за выразным пралетарскім яе зьместам, даючы бязьлітасны адпор тым, хто нацыянальную форму ставіць вышэй пралетарскага зьместу, хто прабуе падмяніць пралетарскі зьмест дробна-буржуазным. Неабходна ўзмацніць барацьбу супроць нацыянал-дэмакратызму і супроць усялякага шавінізму, і асабліва супроць антысэмітызму. Клясавы вораг, контр-рэвалюцыянэр ідзе ў бой супроць пралетарскай дыктатуры пад прыкрыцьцем шавінізму, антысэмітызму, прабуе паслабіць адзінны клясавы фронт усіх працоўных усіх нацыянальнасьцяў. Апошняя абураючая справа на заводзе «Кастрычнік» ёсьць контр-рэвалюцыйная справа, ёсьць выступленьне клясавага ворага. Трэба рашуча ўзмацніць работу па інтэрнацыянальнаму выхаваньню рабочых мас. Пакуль ёсьць клясы, ёсьць клясавая барацьба, кожны пралетары павінен памятаць, што „ёсьць дзьве нацыі ў кожнай нацыі, ёсьць дзьве нацыянальныя культуры ў кожнай нацыянальнай культуры“. Трэба павесьці рашучы наступ супроць клясавага ворага на фронце нацыянальнай палітыкі.

Трэба і ўнутры партыі рашуча змагацца з усялякімі ўхіламі ад бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі, якія заўсёды неразрыўна зьвязаны з агульнымі ўхіламі ад лініі партыі.

5) Аб'бднаны Пленум ЦК і ЦКК, лічачы зусім правільным рашэньні Пленуму ЦК УсеКП(б) па пытаньні аб рэгуляваньні росту партыі і зусім пасьпеўшымі іх ва ўмовах Беларусі, даручае Бюро ЦК і Прэзыдыуму ЦКК дакладна распрацаваць гэта пытаньне, прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё рашэньняў ЦК УсеКП(б) і паставіць гэта пытаньне на бліжэйшым партыйным зьезьдзе КП(б)Б.

Далейшае ўзмоцненае ўзброеньне Францыі

Лік войска ўзрос на 63.000 чалавек больш, чымся перад імпэрыялістычнаю вайною 1914 г.—Вайсковых выдаткаў прыпадае на аднаго чалавека больш 17-ці рублёў.

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБ ВАЙСКОВЫМ БЮДЖЭЦЕ.

ПАРЫЖ, 29-XI. Сёньня ў палаце дэпутатаў у спрэчках па бюджэце вайсковага міністэрства дакладчык камісіі Лафон, між іншым, заявіў, што ў бліжэйшыя гады прыдзецца лічыцца з ростам вайсковага бюджэту, бо неабходна павялічыць склад кадравых афіцэраў да 106.000 і ў зьвязку з фартыфікацыйнаю працаю.

Камуністычны дэпутат Бэрон выступіў з прамоваю, у якой між іншым сказаў: „Буржуазея, наперакор сваім пацыфісцкім заявам, сілаю эканамічнага разьвіцьця вымушана падрыхтоўвацца да міжнароднае і грамадзянскае вайны. У параўнаньні з агульным лікам узброеных сіл у 1913 годзе, на 1929 г. намячаецца павялічыць гэтыя сілы на 63.000 чалавек. Манэўр, які ўжывае ўрад, каб утаіць павялічэньне колькасьці ўзброеных сіл, вельмі прастадушны. Падкрэсьліваючы зьменшэньне ліку прызыўнікоў, урад утойвае павялічэньне ліку вайскоўцаў-прафэсыяналаў, павялічэньне бюджэту, прызначанага на разьвіцьцё тэхнічнага апарату арміі. Частка вайсковых выдаткаў утойваецца ў бюджэтах іншых міністэрстваў, прычым больш трэцяе часткі выдаткаў скарыстоўваецца на вайсковыя патрэбы“. Пры гэтых словах чуюцца галасы: „А што ў Расеі?“, Бэрон адказвае: «У СССР на аднаго чалавека прыпадае вайсковых выдаткаў 4 рублі, у Францыі—17, а ў Англіі—22 руб. Водлуг французкай прапорцыі ўзброеных сіл жыхарства, Чырвоная армія павінна была-б складаць 2 мільёны 400.000 чал. Узмоцненыя ўзброеньні Францыі, наказ самога Фоша, накіраваны проці СССР».

«КАЛЁНІЯЛЬНАЯ ВЫДАТКІ» ЛЮДЗЬМІ.

ПАРЫЖ, 29-XI. Выступіўшы ў спрэчках на бюджэце вайсковага міністэрства вайсковы міністр Пэнлеве заявіў, што павялічэньне афіцэрскіх кадраў да 106000 чалавек у параўнаньні з 1913 годам выклікана патрэбамі абароны калёній, падзеямі ў Кітаі, Сірыі і Марока.

ПУСТАСЛОЎЕ РЭНОДЭЛЯ.

ПАРЫЖ, 29-XI. Выступіўшы ў спрэчках па бюджэце вайсковага міністэрстаа сацыяліст Рэнодэль лічыць бюджэт 1929 г. узрослым у параўнаньні з леташнім і выказвае боязь, што Францыя ня можа вытрымаць вайсковых выдаткаў і тэмпу ўзброеньняў, якія ўстанавіўся за час вайны; Рэнодэль патрабуе перадаць бюджэт вайсковага міністэрства ў спэцыяльную камісію для яго скарачэньня. Пасьля таго, як урад паставіў пытаньне аб давер'і, Рэнодэль патрабуе адкласьці пасяджэньне палаты, каб камісія магла перагледзець бюджэт. Урад ізноў высоўвае пытаньне аб давер'і. Палата большасьцю 385 проці 195 галасоў адхіляе патрабаваньні Рэнодэля аб адкладзе пасяджэньня палаты. Тады Рэнодэль бярэ назад сваю прапанову аб перадачы бюджэту ў камісію.

КРЭДЫТЫ ВАЙСКОВЫМ СУДОМ.

ПАРЫЖ, 29-11. Агенцтва Гаваса паведамляе: „Палата большасьцю 380-ці проці 203-х галасоў адхіляе пададзеную сацыялістамі і падтрыманую камуністамі папраўку, якая патрабуе скасаваць крэдыты для вайсковых судоў.

Кантынэнтальны блёк проці СССР.

ВЕНА, 29-11. Будапэштская лібэральная газэта «Пэшці Наплу» прысьвячае артыкул сучаснаму палітычнаму становішчу ў Эўропе. Газэта робіць вывад, што Англіі і Францыі ўдалося скласьці блёк проці кантынэнтальных дзяржаў. Блёк мае на мэце, з аднаго боку, забясьпечыць перавагу Францыі на сухазем'і, а з другога—падрыхтаваць вайну проці СССР. Сучасныя ўнутрыпалітычныя зьмены ў некаторых краёх, на думку газэты, тлумачацца заснаваньнем гэтага блёку. Газэта лічыць, што ваяўнічыя пляны блёку патрабуюць пашырыць сацыяльны базіс урадаў, якія ўваходзяць у блёк дзяржаў, і ўцягнуць у іх дэмакратычныя партыі. Іменна з гэтае прычыны ў Румыніі заснаван урад нацыянальна-сялянскае партыі, якая мае большае падтрыманьне сярод жыхарства, чымся лібэралы.

ПАДАРОЖЖА РУМЫНСКАГА МІНІСТРА Ў ВАРШАВУ.

ВЕНА, 29-11. З Бухарэсту паведамляюць, што румынскі міністр замежных спраў Міранеску, згодна запросін польскага ўраду, выяжджае ў Варшаву «для заснаваньня больш шчыльнага кантакту ўіж абодвымі ўрадамі».

Дырксэн—нямецкі пасол у СССР.

БЭРЛІН. 29-XI. Агенцтва Гаваса паведамляе, што Гіндэнбург назначыў дырэктара дэпартаманту міністэрства замежных спраў Дырксэна на пасаду нямецкага пасла ў Маскве.

ЗАЎВАГА: Дырксэн нарадзіўся ў 1882 годзе. У 1903 г. атрымаў ступень доктара права. Дыплёматычная дзейнасьць Дырксэна распачалася ў 1917 годзе пры нямецкай місіі ў Гаазе; а потым Дырксэн перайшоў у міністэрства замежных спраў і быў назначан у склад дыплёматычнага прадстаўніцтва ў Кіеве. У студзені 1919 году ён вярнуўся з Кіева і быў назначан ва ўсходні аддзел міністэрства замежных спраў. дзе загадваў рэфэрэнтурою па справах крэсавых дзяржаў. Пасьля гэтага ён быў у складзе нямецкае місіі ў Варшаве. загадваў польскаю рэфэрэнтураю пры міністэрстве замежных спраў, быў генэральным консулам у Данцыге.

Ад лютага 1925 г. да сакавіка 1928 г. займаў пасаду кіраўніка ўсходнім аддзелам міністэрства замежных спраў, а потым дырэктара дэпартаманту і кіраўніка ўсходняга аддзелу.

Вобыскі ў Харбінскіх прафсаюзаў.

ХАРБІН, 29-XI. На працягу 3-х апошніх дзён кітайская паліцыя ўчыняла вобыскі ў будынках харбінскіх аддзелаў прафсаюзаў. Вобыскі ўчынены ў саюзе асьветнікаў чыгункі, саюзе медыцынскіх і санітарных працаўнікоў і ў саюзе працаўнікоў асьветы. У пратаколах вобыскаў зазначана, што нічога процізаконнага ня знойдзена. Не зважаючы на гэта, частка перапіскі забрана са сховаў саюзаў. Адзін супрацоўнік прафсаюзу арыштаваны.

У Саюзе ССР.

4-я сэсія ЦВК СССР.

МАСКВА. Адчыненьне чацьвертае сэсіі ЦВК СССР чацьвертага скліку адбудзецца 3-га сьнежня.

На парадку дня сэсіі; адзіны дзяржаўны бюджэт СССР на 1928-29 год, справаздача аб выкананьні адзінага дзяржаўнага бюджэту СССР 1926-27 году, агульныя асновы земляўпарадкаваньня і землякарыстаньня ў СССР, даклад аб выбарах у саветы 1928-29 г., палажэньне аб бюджэтных правох СССР і саюзных рэспублік, даклад ураду Узбэцкае ССР, зацьверджаньне пастаноў, ухваленых у пэрыяд між сэсіямі.

Назначэньні т. т. Шмідта і Угланава.

МАСКВА. З прычыны назначэньня Шмідта намесьнікам старшыні СНК СССР і Савету Працы і Абароны, УЦСПС 27-га лістапада ўхваліла высунуць кандыдатуру Угланава на пасаду Наркома Працы СССР і прасіць урад зацьвердзіць гэтае назначэньне.

Прэзыдыум ЦВК СССР ухваліў вызваліць Шмідта ад абавязкаў Наркома Працы СССР і назначыць Наркомам Працы СССР тав. Угланава.

Выклік смаленскіх рабочых прыняты Клінцамі.

БРАНСК. 29-XI. Смаленская і бранская дэлегацыі па наладжаньні мітынгу-пераклічкі прыехалі ў Клінцы. На вакзале ім было наладжана ўрачыстае спатканьне. А першай гадзіне дню ў розных канцох гораду на 4 фабрыках адбыліся мітынгі. Усюды тэкстыльшчыкі ўхвалялі пастановы прыняць выклік смаленскіх рабочых і актыўна ўдзельнічаць у кампаніі перавыбараў саветаў.

Мітынг рабочых Ленінскае фабрыкі разам са служачымі Тэкстыльтрэсту аднагодна ўхваліў прыняць выклік смаленскіх фабрык, прычым ухвалена ўцягнуць у гэтую пераклічку навазыбкаўскіх і старадубскіх рабочых. Ухвалена таксама ў наступную суботу адпрацаваць дзьве лішніх гадзіны ў фонд кампаніі перавыбараў саветаў. Мітынг у гарадзкім тэатры прыняў выклік Смаленску і ў свой чарод выклікае на спаборніцтва фабрыкі «Волна Революции» і „Ревпуть“. Мітынг-пераклічка шырока разгортваецца.

Прывітаньне т. Сталіна

рабочым заводу «Красный Профинтерн» у Бежыцы:

«Братэрскае прывітаньне рабочым заводу „Красный Профинтерн“. Вітаю вас з вашаю згодаю на вызаў рабочых «Батушка», Ярцаўскае фабрыкі Жадаю посьпеху ў правядзеньні кампаніі перавыбараў сельсаветаў. Прашу прабачэньня, што ня маю магчымасьці прыехаць да вас на завод.

І. Сталін.

Новы турэцкі пасол у т. Калініна.

МАСКВА, 29-XI. У Вялікім Крамлёўскім Палацы старшыня ЦВК СССР Калінін прыняў нова назначанага пасла Турэцкае рэспублікі ў СССР пана Васыф бея, які перадаў яму вярыцельныя граматы і граматы адкліку ранейшага турэцкага пасла ў СССР пана Тэўфік-бея.

Тав. Калінін і турэцкі пасол абмяняліся прамовамі, у якіх выказвалася ўпэўненасьць у далейшым пашырэньні прыяцельскіх узаемадачыненьняў між народамі СССР і Турцыі. Пасьля афіцыйнае часткі прыёму пасол меў прыватную аўдыэнцыю ў Калініна.

Ганебны ўчынак акад. Жэбелева.

ВУЧОНЫЯ СССР НЯ МОГУЦЬ УДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ЭМІГРАНЦКІХ ВЫДАНЬНЯХ.

ЛЕНІНГРАД. 28-XI. Прэзыдыум Акадэміі Навук на сваім пасяджэньні 22 лістапада абмеркаваў пытаньне аб выступленьні акадэміка С. А Жэбелева. Прэзыдыум ухваліў наступную пастанову: «Лічыць, што ўдзел савецкіх вучоных, а значыць, і супрацоўнікаў Акадэміі Навук СССР у якіх-небудзь эміграндкіх выданьнях ня можа быць дапушчан, што і паставіць на від удзельнікам зборніка «Сэмінарыум Кандакавіанум» з ліку супрацоўнікаў Акадэміі. Прызнаць выступленьне акадэміка С. А. Жэбелева няправільным і паставіць яму на від немагчымасьць дазваляць сабе падобныя ўчынкі. З прычыны 11-цігадовае нясупыннае працы акадэміка С. А. Жэбелева на нарысьць савецкага будаўніцтва і нададзеных ім у прэзыдыум тлумачэньняў па гэтай справе, лічыць, што няма падстаў, каб ужыць у адносінах да яго артыкул 22 статуту Акадэміі Навук.

АБУРЭНЬНЕ ЛЕНІНГРАДЗКІХ ВУЧОНЫХ.

ЛЕНІНГРАД. 28 лістапада на пасяджэньні бюро ленінградзкае сэкцыі навуковых працаўнікоў былі зачытаны рэзалюцыі прафактыву Акадэміі Матар'яльнае Культуры і праўленьня Унівэрсытэту, якія далучаюцца да рэзалюцыі сэкцыі аб выключэньні з яе шэрагаў акадэміка Жэбелева і аб нежаданьні пакідаць яго ў ліку сяброў Акадэміі Навук.

Пасьля гэтага быў заслуханы ліст прафэсара Н. Сычова, адказнага працаўніка расейскага музэю, аднаго з удзельнікаў праскага зборніку. Прафэсар Сычоў прызнае сваю мімавольную правіннасьць перад СССР, але адхіляе з свайго боку жаданьне зрабіць знарок такі ўчынак.

Накопт агалошанае ў газэтах пастановы Варнітсо аб немагчымасьці пакінуць у шэрагах Акадэміі Жэбелева. М. Растоўцава, П. Струвэ, акадэмік С. С. Ольдэнбург катэгарычна заявіў оходу, што Растоўцаў і Струвэ з 1920 году ня лічацца сябрамі Акадэміі Навук.

ВЫПУСК БАНКНОТ У 5 ЧЫРВОНЦАЎ.

МАСКВА. 31-га кастрычніка гэтага году управа Дзяржбанку СССР ухваліла выпусьціць у зварот банкавыя білеты 5-цічырвоннае вартасьці ўзору 1928 году і назначыць першым тэрмінам выпуску 1-га сьнежня 1928 г.

* * *

У гутарцы з прадстаўнікамі друку намесьнік старшыні управы Дзяржбанку Пятакоў зазначыў: «Выпуск банкавых білетаў 5-цічырвоннае вартасьці ўзору 1928 г. не зьяўляецца выпускам новых грошай. Выпуск 5-цічырвоннага банкноту новага ўзору робіцца ў выкананьне намечаных управаю Дзяржбанку мерапрыемстваў аб паступовай замене выпушчаных раней узораў білетаў на новыя білеты, зробленыя з паперы лепшае якасьці».

Усесаюзная нарада рабселькораў.

ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КАНЦОЎ СССР ВІТАЮЦЬ СВАЮ ГАЗЭТНУЮ АРМІЮ.

МАСКВА, 29-XI. На ранішнім пасяджэньні ўсесаюзнае нарады рабселькораў 29 лістапада распачаліся спрэчкі па дакладзе Бухарына і было заслухана шмат прывітаньняў.

Рабкор ленінградзкага заводу «Электрасіла» ДЫБМАН прывітаў нараду ад рабкораў свайго заводу і перадаў прэзыдыуму нарады падарунак рабкораў заводу „Электрасіла“—вялікую мэталёвую настольную пісьмовую прыладу. Кожная з дзьвюх чарнільніц гэтага прыбору ўяўляе сабою макет турбагенэратара: адзін турбагенэратар Волхаўстрою і другі—Днепрастрою. У сярэдзіне—фігура Леніна.

Потым нараду вітаў ад імя чырвоных мэталёўцаў Адэшчыны т. КУСЭЛЬ.

КАВАЛЁЎ вітаючы нараду ад імя 9-е партыйнае гарнізоннае канфэрэнцыі Маскоўскае губэрні, заклікае рабселькораўскую армію шчыльней зьвязацца з Чырвонай арміяй.

Тав. ПЭЎНЫ (рабкор заводу «Чырвоны Аксай», Растоў-Дон), зазначае на патрэбу з дапамогаю партыі шырэй разгарнуць самакрытыку, бо на мясцох яе часта зажымаюць. Аб гэтым-жа гаварыў і Кірымаў (Азэрбайджан).

Гучнымі воплескамі сход спаткаў тав. ФРЫДРЫХА, рэдактара Дусэльдорфскае газэты «Фрайхэйт» (Нямеччына), які перадаў гарачае прывітаньне нарадзе ад рабочых свайго раёну. Фрыдрых зазначыў, што чужаземныя рабкоры прыехалі на нараду павучыцца ў савецкіх рабселькораў і ўвесь набыты вопыт выкарыстаць у сваёй працы.

У працягу ўсяго дзённага пасяджэньня ня спыняліся спрэчкі па дакладзе т. Бухарына. У канцы пасяджэньня т. Лукіенка, рабкор Горлаўскага заводу (Данбас) перадаў нарадзе мадэлі цяжкае і лёгкае ўрубовых машын і мадэль вагавэткі, на якой вывозіцца сьмецьце з капальняў.

Работніца Данское дзяржаўнае фабрыкі перадала нарадзе ад імя рабкораў ф-кі макет, які паказвае рост рабкораўскае арганізацыі на заводзе.

Рабкоры ленінскіх майстэрняў Паўночна-Каўкаскіх чыгунак перадалі нарадзе партрэт Леніна, зроблены бясканструйным апаратам па шкляным шкле, выпаленым рабкорам гэтых майстэрняў.

Рабочыя і служачыя Адэскага вагавага заводу перадалі падарунак свайй прадукцыі—вагу.

Рабкор „Красного Путиловца“, Каталёў перадаў нарадзе мадэль трактару і адрас.

* * *

МАСКВА. На вячэрнім пасяджэньні нарады рабселькораў 29 га лістапада адбываліся далей спрэчкі па дакладу т. Бухарына. Некаторыя з выступаўшых рабкораў перадалі нарадзе падарункі. Асабліва зьвярнула цікавасьць мадэль чыгуначнага мосту праз рэчку, прысланая рабкорамі Закаўкаскіх чыгуначных майстэрняў.

БЫЦЬ ЗАСТРЭЛЬШЧЫКАМІ НОВАГА БЫТУ.

Бурнымі воплескамі нарада сустракае КРУПСКУЮ. Спыняючыся на пытаньнях народнае асьветы, вынішчэньня няпісьменнасьці і культурнае рэвалюцыі, Крупская зазначае на патрэбу раскалыхаць шырокія мільённыя масы, якія павінны самі ўзяцца за вырашэньне ўсіх гэтых пытаньняў. Пра гэта нясупынна казаў тав. Ленін. Але гэтыя словы заставаліся толькі словамі. Толькі сёлета ўвосень на асобных вучастках, як, напрыклад, у Саратаве, у асобных вёсках выявілася, як трэба брацца за гэтую справу самім масам. Велічэзнае значэньне ў гэтай справе маюць нашыя гарсаветы і сельсаветы, якія павінны арганізоўваць і згуртоўваць навакол сябе масы. Але ў працы саветаў ёсьць яшчэ шмат бюракратызму і нядзельнасьці падыйсьці да пытаньняў. Рабкоры і селькоры павінны ўзяць пад абстрэл працу сэкцый і ажывіць яе. У нас шмат гавораць пра калектыўныя гаспадаркі, але закранаюць, пераважна, гаспадарчы бок, а пра быт калектыўных гаспадарак гавораць і пішуць мала. Вось прыклад,—калі за п'янства было выключана з камуны некалькі яе сяброў, жонкі з дзецьмі засталіся ў камуне. Вось гэта кавалак новага быту.

Гэта трэба асьвятляць у друку. Праца рабселькораў ва ўсіх гэтых галінах мае вялікае значэньне.

ДЗІКАСЬЦЬ ЦЭНЗУРНЫХ РЭПРЭСІЙ У ВЭНГРЫІ.

КАНФІСКАЦЫЯ ТВОРАЎ Л. ТАЛСТОГА. НАВАТ КНІЖКІ МАКДАНАЛЬДА І МЕНШАВІЦКІЯ ГАЗЭТЫ Ў РАЗРАДЗЕ ЗАБАРОНЕНЫХ.

ВЕНА, 29-XI. З Будапешту паведамляюць, што сацыял-дэмакратычны дэпутат Д'ёркі падаў у парлямант запытаньне наконт забароны прывозу ў Вэнгрыю твораў чужаземнага друку, між іншым, замежных сацыял-дэмакратычных органаў і газэты „Фосішэ-Цэйтунг“. Д'ёркі зазначыў, што паліцыя надоечы забараніла сьпеў Шумана—Гейнэ „Два грэнадзёры“, абгрунтоўваючы гэта тым, што заключныя акорды сьпеву напамінаюць „марсэльезу“. Канфіскуюцца кніжкі ў бібліятэках прафсаюзаў. Канфіскаваны творы Льва Талстога,кніжкі Макданальда і г.д.

У адказе прэм'ер Бэтлен апраўдваў цэнзурныя мерапрыёмствы, завяраючы, што паліцыя ў Сегедзе выкрыла пад выглядам эспэрантыскае карэспандэнцыі бальшавіцкую агітацыйную літаратуру. У Сэнтэшы ў старшыні мясцовае сацыял-дэмакратычнае арганізацыі Катарвіца выкрыта, нібыта, камуністычная літаратура. «Бальшавіцкая агітацыя,—зазначыў Бэтлен, — хоча абаперціся ў першую чаргу на сельска-гаспадарчых рабочых. Забараняючы кніжкі Бухарына, урад абараняе край».

РАЗГОН ЛЕВЫХ ЛАТВІЙСКІХ ПРАФСАЮЗАЎ УЗАКОНЕН.

РЫГА, 29-XI. Учора акруговы суд, разглядзейшы справу аб зачыненьні міністэрствам унутраных спраў левых прафсаюзаў у Рызе, зацьвердзіў захады міністэрства. Абвінаваўцам выступіў начальнік ахранкі Озолінш, які зачытаў, між іншым, ліст ранейшага сэкратара ЦК латвійскае сацыял-дэмакратычнае партыі Бруно Кальніша да выканкому 2-га Інтэрнацыяналу. У лісьце Кальнінш называў левыя прафэсыянальныя саюзы «камуністычнымі арганізацыямі».

Газэта левага крыла рабочага руху „Дарбс ун Майзэ“ піша: «Можна зачыніць левыя прафсаюзы, але нельга зьнішчыць рэвалюцыйнага прафэсыянальнага руху Латвіі».

Антысавецкая афарбоўка амэрыканскага рэфармізму.

„РАЗЬВЕНЧВАНЬНЕ“ ПРАФ. ДЗЮІ ПРЫСЛУЖНІКАМІ ГРЫНА.

НЬЮ-ЁРК, 29-XI. Зьезд амэрыканскае фэдэрацыі працы выступіў проці прафэсара Дзюі, які быў на чале амэрыканскае дэлегацыі ў СССР. Падставаю для выступленьня проці Дзюі было тое, што ён зьяўляецца «прыхільнікам саветаў». Раней асьветная камісія амэрыканскае фэдэрацыі працы характарызавала Дзюі, як „усюды прызнаны аўтарытэт у пытаньнях асьветы“. Зараз зьезд ухваліў рэзалюцыю з патрабаваньнем выкінуць гэты абзац.

Дзюі зьяўляецца сябрам амэрыканскае фэдэрацыі настаўнікаў, якая далучаецца да амэрыканскае фэдэрацыі працы. Зараз Дзюі зьнішчае артыкулы ў лібэральным органе „Нью-Рэпублік“, у якіх зазначае, што ён не падтрымлівае палітычнае і эканамічнае сыстэмы ў СССР, а толькі ў захапленьні ад асьветных, маральных і разумовых пэрспэктыў рэвалюцыі.

РЭАКЦЫЙНЫЯ ПРАФЛІДАРЫ ПЕРААБРАНЫ.

НЬЮ-ЁРК. На зьезьдзе амэрыканскае фэдэрацыі працы ў Нью-Арлеане Грын пераабраны старшынёю фэдэрацыі. Іншыя рэакцыйныя службовыя асобы таксама пераабраны. Прадстаўнікоў левага крыла на зьезьдзе няма; гэтым тлумачыцца, што ўпяршыню пасьля 1918 году на зьезьдзе фэдэрацыі не пададзена рэзалюцыі з патрабаваньнем прызнаць СССР.

ПРОЦІ ЗАХОПНІЦКІХ ІМКНЕНЬНЯЎ ВАШЫНГТОНУ.

НЬЮ-ЁРК, 29-XI. Цэнтральны камітэт Уоркерс Партыі (камуністычнай) агаласіў адозву, накіраваную проці падарожжа Гувэра па Лацінскай Амэрыцы. Адозва заклікае рабочых пратэставаць проці агрэсыўнае палітыкі Злучаных Штатаў у Лацінскай Амэрыцы, патрабаваць незалежнасьці калёніяльных краёў і весьці барацьбу проці ваенных падрыхтаваньняў, накіраваных проці СССР.

ЗЬНІЖЭНЬНЕ ЗАРАБОТКУ У АМЭРЫЦЫ.

НЬЮ-ЁРК, 29-XI. Аб'яднаны саюз тэкстыльшчыкаў дазволіў забастоўку 15.000 тэкстыльшчыкаў у Род-Айлендзе ў знак пратэсту проці зьніжэньня заработку на 5 проц.

СХОД ПАРТАКТЫВУ.

У аўторак, 4-га сьнежня, а 6 з пал. гадзіне ўвечары ў клюбе імя Карла Маркса склікаецца сход гарадзкога партактыву.

ПАРАДАК ДНЮ:

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гамарніка аб выніках апошніх пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Увaход па білетах разасланых Райкомам КПБ. Члены і кандыдаты ЦК, ЦКК, АК, АКК, РК КПБ, члены Бюро ЦК, АК КСМ уваходзяць па сваіх сяброўскіх пасьведчаньнях.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Агульная мова знойдзена

ВАРШАВА, 29-XI. Канфлікт між соймам і ўрадам, які выбухнуў у сувязку з прамоваю міністра ўнутраных спраў Складкоўскага аб сакрэтных фондах, уладжан прамоваю прэм'ера Бартэля ў бюджэтнай камісіі. Бартэль вельмі мякка абмеркаваў тон прамовы Складкоўскага і гаварыў, што ўрад у бліжэйшы час падасьць у сойм законапраэкт аб узаконьваньні перавыдаткаў бюджэту ўраду. Апазіцыя сойму заявіла, што цалкам задаволена тлумачэньнямі Бартэля.

Удзячнасьць лодзінцаў пралетарыям СССР.

ВАРШАВА, 28-XI. З Лодзі паведамляюць, што на дэлегацкім сходзе рабочых лодзінскіх тэкстыльных фабрык ухвалена прапанаваная левымі рэзалюцыя з выказам савецкім прафсаюзам шчырае пралетарскае ўдзячнасьці за братэрскую дапамогу рабочым Лодзі.

Рэзалюцыя падкрэсьлівае, што перамога няспыніўшых барацьбы рабочых Відзеўскае мануфактуры залежыць ад далейшае міжнароднае дапамогі.

Роспуск украінскіх пажарных т-ваў.

ВАРШАВА, 29-XI. Станіслаўскі ваявода распусьціў украінскія вольна-пажарныя таварыствы «Луг» і «Сакол».

НОВАЯ УКРАІНСКАЯ ЗГОДНІЦКАЯ ПАРТЫЯ.

ВАРШАВА, 29-XI. Водлуг паведамленьняў органа УНДО «Діло», з 1-га сьнежня ў Польшчы пачне працаваць новая украінская партыя, старшынёю якое зьяўляецца Уладзімір Залёзецкі. Устаноўчы збор новае партыі адбыўся 18-га лістапада.

Канфіскацыі.

Нядзельнае выданьне «Газэты Быдгоскей» і «Дзеньнік Быдгоского» сканфіскаваны за зьмяшчэньне часткі мовы пасла В. Трампчынскага, сказанай ім на пасяджэньні бюджэтнай камісіі.

Бура на польскім узьбярэжжы.

Ужо некальні дзён на Балтыцкім моры шалее бура. Польскае школьнае судно „Львоў“ ня можа дабрацца да порту і ўжо два дні знаходзіцца між Розевем і Гэлем. Лёс рыбацкіх суднаў, якія выплылі ў поўнае мора, не вядомы.

Рэпрэсіі проці украінскіх арганізацый.

Новы станіслаўскі ваявода Наканечнікаў—Клюкоўскі зачыніў цэлы шэраг гімнастычных і пажарных украінскіх таварыстваў у 13 мясцовасьцях. Апрача таго, зачынены пажарна-гімнастычныя таварыствы ў Шыдагове і Туры.

Чыгуначныя катастрофы.

На ст. Годуў катовіцкай дырэкцыі здарылася чыгуначная катастрофа: цягнік таварнага поезду і адзін вагон вышлі з рэяк Ахвяр ня было.

На лініі вузкакалейкі Нова-Ельня—Навагрудак здарылася чыгуначная катастрофа. Зышлі з рэяк 3 вагоны. Ахвяр ня было.

* * *

На ст. Бшэзінка, катавіцкай дырэкцыі здарылася чыгуначная катастрофа. 2 цягнікі і 6 вагонаў разьбіты.

На станцыі Тыхі той-жа лініі ў часе катастрофы разьбіліся 7 вагонаў і 4 папсаваны. 3 асобы лёгка паранены.

Новы вялікі беларускі працэс у Польшчы

27 лістапада ў Навагрудку пачаўся новы вялікі беларускі працэс. На лаўцы абвінавачаных сядзяць: пасол Сташановіч Аляксандр, выданы соймам суду, Андрэй Анастас, Кандрацюк Анастас, Малец Антон, Міхалеўская Ванда, Журко Уладзімір, Алешкевіч Анастас, Рананюк Ян, Грыц Уладзімір, Малец Ян, Тур Васіль, Марыло Антон, Хвасько Павал, Люстач Аўстафі, Чужаземец Уладзімір, Люшач Ян, Дударэвіч Ян, Нікіпаровічы Аляксандра і Сьцяпан, Ледзько Ян, Малец Антон (2-гі).

Склад суду: старшыня Мурза-Мурвіч, судзьдзя Паўлюць і судзьдзя Карновіч. Абвінавачвае пракурор Хадзецкі.

Абвінавачаных бароняць адвакаты: Гавігвіль, Сьмяроўскі, Сьвірыд, Гумэнэр, Аляксюк і Будахоўскі.

Пасьля адчыненьня судовага працэсу быў зачытан акт абвінавачаньня, з якога вынікае, быццам на абшары паветаў Навагрудзкага ваяводзтва існавала ў 1927-28 г. «камуністычная» арганізацыя, дзейнасьць якой выяўлялася ў зьбіраньні мітынгаў, распаўсюджваньні камуністычных адозваў, вывешваньні чырвоных сьцягаў з „антыдзяржаўнымі“ надпісамі, «антыдзяржаўнай» агітацыі і ў «камуністычных» дэманстрацыях. Дзейнасьць арганізацыі асабліва ўзмацнілася ў часе выбараў у сойм і сэнат. Паасобныя сябры партыі зьбіралі канфэрэнцыі, на якіх абгаварваліся партыйныя справы і сродкі, якімі належыць падтрымліваць на гэтым абшары замаскаваны камуністычны сьпіс № 39. Быццам сьцьверджана, што паасобныя сябры арганізацыі мелі зброю і прылады для адбіцьця адозваў. У момант ліквідацыі арганізацыі, у часе рэвізіі, быццам знойдзен вялікі кампраметуючы матар'ял: зброя, брашуры, нататкі, адозвы, шапірографы і справаздачы з пасяджэньняў і рэфэратаў. Пасьля зачытаньня акту абвінавачаньня суд выслухаў паасобных абвінавачаных, з якіх 6 прызналася, што яны належаць да камуністычнай партыі, але да віны ня прызналіся.

На суд выклікана 115 сьведкаў. Між іншым, у якасьці сьведкі выступіў навагрудзкі староста Грынеўскі, які на запытаньне, што ён можа сказаць аб пасьле Сташановічу, асьведчыў, што ведае яго, як вельмі добрага земляроба і актыўнага дзеяча на грунце зямельнай вытворчасьці. Пасьля гэтага ён асьведчыў, што сьпіс № 39 ён лічыў за замаскаваны камуністычны сьпіс. На пытаньне аднаго з абаронцаў, кім ён лічыць пасла Дварчаніна, асьведчыў, што лічыць яго камуністычным дзеячом; што тычыцца іншых абвінавачаных, то сьцьвярджае, што ведае іх толькі, як сяброў валасных рад.

Наступнае пасяджэньне 28 лістапада ў 10 гадз. раніцы.

VIII усебеларускі зьезд працаўнікоў асьветы

Бліжэйшыя задачы настаўніцтва.

(З дакладу Наркамасьветы т. Баліцкага).

На вячэрнім пасяджэньні з дакладам выступіў Народны Камісар Асьветы БССР тав. Баліцкі.

— Лёзунг — «культурная рэвалюцыя» — ніколі ня быў такім сваечасовым, такім патрэбным, як зараз. Камунізм, кажа т. Баліцкі, немагчым бяз высока-паднятай культуры, бяз культурнасьці самога насельніцтва. Нашы новыя фабрыкі і заводы пабудаваны па апошняму слову тэхнікі. На гэтых фабрыках і заводах машына замяняе працу чалавека, але машынам патрэбен культурны і разьвіты рабочы. Сельская гаспадарка, падняцьце ўраджайнасьці таксама не магчымы бяз культурнай рэвалюцыі ў вёсцы. Увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня павінна даць большы эфэкт, чым сотні аграномаў. Каб зьнішчыць бюракратызм у нашых установах і арганізацыях неабходзен самы шырокі ўдзел у працы іх працоўных мас, а гэтае таксама ўпіраецца ў неабходнасьць культурнай рэвалюцыі.

Дыктатуру пралетарыяту мы замацуем толькі тады, калі рабочыя і сяляне займуць у нашым культурным і гаспадарчым будаўніцтве ўсе камандныя высоты.

Каго мы рыхтуем і чаму вучым? Ці выхоўваем мы ў нашых школах таго, хто нам патрэбен? Ці няма ў нас у гэтай вялікай і важнай працы крэну?

У галіне падняцьця культурнага ўзроўню насельніцтва вялікае значэньне мае 4-хгадовая працоўная школа. Некалькі год таму назад нам гаварылі — няма чаго гнацца за колькасьцю, а трэба больш зьвярнуць увагу на якасьць школ. Мы ведалі, што школа наша ў якасных адносінах была дрэннай, але яна ліквідавала няпісьменнасьць.

Зараз-жа мы павінны паставіць і ставіць увесь час пытаньне аб якасьці школьнай працы. Сёлета СНКБССР даў установку аб палепшаньні якасьці масавых культасьветных устаноў разам з разгортваньнем сеткі апошніх.

Сёлета мы разам з масамі асьветнікаў перапрацавалі плян увядзеньня ўсеагульнага навучаньня і павінны яго праводзіць у жыцьцё. Між тым у большасьці акруг па мясцоваму бюджэту праводзіцца толькі 50 проц. нашага пляну. Гэта недапусьціма ў момант разьвіцьця культурнай рэвалюцыі.

Чаму ж гэта так? Наш мясцовы бюджэт ня можа вытрымаць такіх аграмадных выдаткаў на правядзеньню пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня. Да 1934-35 г. нам патрэбна расходваць на ажыцьцяўленьне пляну 110 мільёнаў рублёў. Ажыцьцявіць гэты плян мы можам толькі пры дапамозе саюзнага ўраду.

У 5-хгодцы мы прадбачым павялічэньне зарплаты настаўніку чатырохгадовак да 70 руб. і II канцэнтру сямёхгадовак да 110 р. 70 р.—гэта ня тое, што патрэбна настаўніку, але большага павялічэньня не дазваляюць нашы рэсурсы. Зараз на абсталяваньне 1-й школы адпускаецца 120 руб., а к канцу мы думаем давесьці да 245 руб. Зьмяншаем у пляне і нагрузку на настаўніка з 47 да 40 вучняў.

У галіне дашкольнага выхаваньня нам прыдзецца застацца на сучасных пазіцыях, бо пакуль мы не ўвялі ўсеагульнага абавязковага навучаньня, нельга пашырыць сетку дашкольных устаноў. Мы бярэм курс на пашырэньне грамадзкай ініцыятывы, якая прыносіць штогод дзесяткі новых дашкольных устаноў.

Дзіцячыя дамы і барацьба з бяспрытульнасьцю застаюцца ў цэнтры нашай увагі. На працягу 5 год мы маркуем зьнішчыць усю бяспрытульнасьць. Мы ня спыняемся перад прымусовым зьмяшчэньнем дзяцей у дзіцячыя дамы. Фактычна бяспрытульнасьць значна паменшылася, напрыклад, у Маскве і Менску вы ўжо ня ўбачыце бяспрытульных дзяцей, мы гаворым тут толькі аб бяспрытульных, а не аб безнаглядных. Сетка дзіцячых дамоў застаецца стабільнай.

Далей т. Баліцкі пераходзіць да якаснага боку працы масавых культасьветных устаноў.

Раней настаўнікі скардзіліся, што няма праграм, няма падручнікаў. Зараз ёсьць добра апрацаваныя праграмы з мэтадычнымі тлумачэньнямі, ёсьць і падручнікі прыстасаваныя да гэтых праграм. Між тым, мы назіраем, што наша школа дае слабую прадукцыю. Кожны год пры прыёме ў ВНУ, тэхнікумы і прафшколы мы сустракаемся са слабай падрыхтаванасьцю дзяцей, асабліва па матэматыцы і мове.

У асьветнікаў існуе думка, што настаўнік не нясе адказнасьці за набыцьцё фармальных ведаў. Гэта думка няправільная. Ён нясе поўную адказнасьць за веды вучняў і нам ня трэба забываць, што неабходна ісьці далей у галіне набыцьця фармальных навыкаў вучнямі.

Інспэктура перадала цэлы шэраг фактаў, калі настаўнікі не ведаюць нашых праграм, вядуць працу саматугам.

4-хгадовая школа зараз павінна поўнасьцю праходзіць сваю праграму. Калі яна перагружана, дык давайце агульнымі сіламі яе выпраўляць.

Мы паднялі граматнасьць, але закінулі выхаваньне. Гэтай справе наша школа не надавала належнай увагі. Завастраючы ўвагу на вучобе, трэба ва ўсю шырыню паставіць пытаньне выхаваўчай працы школы. Было-б памылкай, калі-б мы спасылаліся на аб'ектыўныя ўмовы, што школай не вывучаецца пытаньне выхаваньня дзяцей. У нашых школах ёсьць рэлігійныя гурткі, гэта сьведчыць аб тым, што капіталістычны элемэнт хоча з намі весьці барацьбу за ўплыў на дзяцей.

Тав. Баліцкі прыводзіць шэраг прыкладаў рэлігійнасьці, антысэмітызму і інш. хворых зьявішч нашай школы і гаворыць, што дробна-буржуазны асяродак больш робіць уплыву на школу, чым нашыя пэдкалектывы. Мы мімаволі выхоўваем мешчаніна.

Для зьнішчэньня гэтага нам трэба ажыцьцёвіць працоўнасьць нашай школы. Патрэбны майстэрні, сельска-гаспадарчыя прылады і сродкі на матар'ял. Між тым, значнай часткі гэтага ў нас няма: зямельныя вучасткі здаюцца ў арэнду, ці апрацоўваюцца наёмным трудом, у школах няма дзе зьмясьціць майстэрняў. Адразу на ўсіх школах гэтага ня зробіш, трэба ўтвараць базісы—добра абсталяваць асобныя школы. Сродкі ад камсамольскага суботніка пойдуць на абсталяваньне майстэрняў. Усё настаўніцтва павінна падтрымаць камсамол у правядзеньні гэтага суботніка.

Грамадзка-палітычнае выхаваньне ў школах пастаўлена вельмі слаба. Зараз мы былі сьведкамі здарэньня на фабрыцы «Октябрь» і інш. На гэтых здарэньнях трэба завастрыць увагу нашай школе. Трэба ўцягваць дзяцей у грамадзкія арганізацыі, прымаць усе меры, каб выхаваць калектыўную асобу. Мы назіраем у школах анты-нацыянальныя супярэчнасьці. Трэба кожны выпадак высьвятляць на сходах вучняў. Трэба выкарыстаць усё, каб зблізіць дзяцей розных нацый паміж сабой. Блізасьць павінна быць не па нацыянальнасьці, а па клясе.

Фізкультуры ў школах адводзіцца нязначная колькасьць гадзін, а між тым фізычнае выхаваньне дзяцей мае вялікае значэньне. Пытаньне палавога выхаваньня самае нераспрацаванае і разам з тым самае актуальнае пытаньне.

Антырэлігійнае выхаваньне пастаўлена ў вас таксама дрэнна, слаба скарыстоўваецца вучэбны матар'ял, мала растлумачваюцца здарэньні з пункту погляду навукі і крытыкі. Гурткі бязбожнікаў не працавалі, а ў большасьці школ іх ня было.

Усё гэта дае магчымасьць дробна-буржуазнай ідэалёгіі пашырацца ў школе. Ня разьвіта ў школе і клясавае пачуцьцё: школа не зварочвае ўвагі дзяцей на акаляючую нас клясавую барацьбу.

Настаўніцтва павінна да вучобы дадаць выхаваўчую працу. Каб паставіць яе належным чынам, трэба школу ператварыць у клюб. Такія-ж задачы па выхаваньні стаяць і перад нашымі дашкольнымі ўстановамі і дзіцячымі дамамі.

Тав. Баліцкі ставіць пытаньні: хто вучыць, чаму вучаць і як вучаць? Ці могуць тыя кадры, якія ў нас ёсьць, выканаць пастаўленыя перад школай задачы?

— Можна сказаць, што большасьць настаўніцтва гэтыя задачы выканаць можа. Мы настаўніцтва падзяляем на 4 групы—1-ая—гэта пэдагагічныя кадры, якія цалкам ідуць за савецкай уладай, гатовы змагацца за дыктатуру пралетарыяту, якія хоць і непартыйныя, а праводзяць цалкам лінію партыі; 2-я група хістаючыяся, якія ня маюць цьвёрдага сьветапогляду; 3-я група гэта палітычнае балота, яны завуць сябе апалітычнымі—мая справа вучыць, а ня выхоўваць і 4-я група гэта варожыя нам элементы. Але ўсё гаворыць за тое, што нашае настаўніцтва ў пераважнай большасьці зможа выканаць пастаўленыя задачы ў галіне выхаваньня новага чалавека.

У заключэньне т. Баліцкі спыняецца на якасьці працы масавых паліт-асьветных устаноў і ліквідацыі няпісьменнасьці. Масавая праца пастаўлена слаба: дрэнна працуе хата-чытальня, кіно-перасоўка, радыё і г. д. Тут набывае вялікае значэньне пэрсанальны склад гэтых устаноў. Калі дрэнны хатнік, дык дрэнна будзе працаваць і найлепш абсталяваная хата-чытальня.

Мы адчынілі ў Магілеве палітасьветны тэхнікум, які зможа даць кваліфікаваных працоўнікоў. Дапамагчы ў працы хаты-чытальні і нардамоў можа кожны культурны чалавек. Тут асьветнік можа шмат чаго зрабіць. Тав. Ленін ніколі ня мысьліў, што настаўнік можа абмежавацца толькі школьнай працай. Настаўнік зьяўляецца культурнай сілай на вёсцы і ён павінен разварушыць культурную рэвалюцыю. Няпісьменнасьць у нас яшчэ вялікая і ўсе культурныя сілы павінны дапамагчы дзяржаве ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці. У гэтай працы павінны прыняць самы актыўны ўдзел і школьнікі 7-хгодак і інш. школ. Ніводнага няпісьменнага ў раёне школы—вось бліжэйшая наша задача.

АД РЭДАКЦЫІ: Падрабязны даклад т. Баліцкага будзе зьмешчан у чарговым дадатку да газэты „Працаўнік Асьветы“.

Прывітаньне Беларускай Акадэміі Навук.

На вячэрнім пасяджэньні зьезд ад імя Беларускай Акадэміі Навук вітаў прэзыдэнт апошняй т. Ігнатоўскі.—Наша акадэмія будавалася ва ўмовах Кастрычніка, будавала яе камуністычная партыя з працоўнымі масамі. Тав. Ігнатоўскі заклікае ўсіх асьветнікаў прыняць актыўны ўдзел у працы Беларускай Акадэміі Навук.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітаньне Беларускай Акадэміі Навук.

— Асьветнікі заяўляюць, што Інбелкульт ад правапісна-тэрміналёгічнай камісіі разьвіўся ў сапраўды сталую навуковую ўстанову акадэмічнага тыпу.

Беларуская Акадэмія Навук будзе зьяўляцца маяком беларускай культуры і навукі ня толькі для працоўных Савецкай Беларусі, але і для працоўных тэй часткі Беларусі, якая знаходзіцца пад сацыяльным і нацыянальным уціскам польскага пана і капіталістых.

Асьветнікі абяцаюць усімі сіламі дапамагчы Беларускай Акадэміі Навук у разгортваньні яе працы.

ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ПРАЦОЎНЫМ ЖАНЧЫНАМ.

СЬВЯТА ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН—СЬВЯТА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ.

Дзесяць год прайшло з таго часу, як камуністычная партыя, утварыўшы жаночыя аддзелы пры партыйных камітэтах, пачала арганізоўваць працоўных жанчын дзеля шырокага ўцягненьня жанчын у барацьбу за саветы і сацыялістычнае будаўніцтва. За гэтыя гады працоўныя жанчыны Беларусі далі многа барацьбітак на франты, а таксама добрых працаўніц у саветы, на кіруючую і звычайную працу ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі.

Сёньня мы можам без пераўвялічэньня сказаць: Савецкая Беларусь адбілася ад сваіх ворагаў, захавала самастойнасьць і шпарка ідзе па шляху адраджэньня і разьвіцьця сваей гаспадаркі і культуры, дзякуючы ўдзелу ў працы і барацьбе работніц, батрачак, сялянак і ўсіх працоўных жанчын. Разам з гэтым мы павінны адзначыць, што пакуль што нам не ўдалося арганізаваць усіх працоўных жанчын, і таму задача па ўцягненьню ўсіх працоўных жанчын разам з мужчынамі ў будаўніцтве Савецкай Беларусі намі ня выканана. Значыць, калі мы маем шэраг недахопаў у нашай працы, калі часта ў нас не хапае сіл дзеля зьнішчэньня цяжкасьцяў, то гэта ў значнай меры таму, што ёсьць яшчэ многа працоўных жанчын, якія ня прымаюць удзелу ў нашай працы.

Вось чаму нам трэба выкарыстаць сьвята дзесятай гадавіны існаваньня жаночых аддзелаў ня толькі дзеля таго, каб сказаць, што намі ўжо зроблена ў сэнсе ўцягненьня жанчын у працу, але галоўным чынам дзеля таго, КАБ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ДАЛЕЙШАМУ, ЯШЧЭ БОЛЬШАМУ РАЗГОРТВАНЬНЮ ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН, ПРЫЦЯГНУЎШЫ ДА ГЭТАЕ ПРАЦЫ ЎВАГУ ЯК САМІХ ЖАНЧЫН, ТАК І НАОГУЛ УСІХ ПРАЦОЎНЫХ І ЎСІХ НАШЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. Вось чаму сьвята працоўных жанчын павінна быць сьвятам усіх працоўных.

Шчыра вітаю працоўных жанчын Беларусі са сьвятам!

А. ЧАРВЯКОЎ.

ПРАЦОЎНАЯ ЖАНЧЫНА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМПАРТЫІ ПРЫДЗЕ ДА ЛЕПШАЙ БУДУЧЫНІ.

Беларуская Акадэмія Навук шчыра вітае Жаночы Аддзел ЦК КП(б)Б у дзесятую гадавіну яго цяжкай, але вельмі патрэбнай і карыснай у нашым сацыялістычным будаўніцтве працы.

Кастрычнікавая рэвалюцыя ачысьціла «глебу ад хламу старых буржуазных законаў і ўстаноў» (Ленін, т. XVI, ст. 256). Але яшчэ шмат працы стаяла перад пралетарыятам на шляху вызваленьня жанчын. Працоўная жанчына была прыкута і яшчэ прыкута да дробнай дапаможнай гаспадаркі, якая «рабіла і робіць жанчыну «домашней рабыней» (Ленін, там-жа).

Разьвінуўшаяся пасьля Кастрычніка і вырасшая ў сучаснасьці ў вялікае гістарычнае зьявішча культурная рэвалюцыя будуе новае жыцьцё. Паступова ўтвараюцца новыя формы быту гаспадаркі і асьветы. Ужо жанчына —работніца, сялянка і пралетарская інтэлігентка — паступова вызваляюцца ад тых-жа эканамічна-бытавых абставін, якія засталіся нам у спадчыну ад старых часоў.

Пралетарыят сцэмантаваў наўкола сябе працоўныя масы. Ідзе барацьба за „поўнае зьдзейсьненьне сацыялізму, дзе для жанчыны адкрываецца вельмі вялікі простор для работы» (Ленін, т. XVI, ст. 359). У гэтай масавай барацьбе Жаночы Аддзел заняў пачэснае месца. І гэта зразумела. Калі «мы гаворым, што вызваленьне рабочых павінна быць справаю саміх рабочых, таксама і вызваленьне жанчын-работніц павінна быць справаю саміх жанчын-работніц» (Ленін, т. XVI, ст. 360). За жанчынай-работніцай узьнімаецца маса працоўнай жанчыны. Шпарка ідзе будаўніцтва пралетарскай культуры і сацыялізму. Жаночы Аддзел зьяўляецца і ўвесь час зьяўляўся арганізатарам і кіраўніком жаночага ўдзелу ў гэтым будаўніцтве.

Яшчэ шмат працы і цяжкасьцяй ляжыць на шляху поўнага вызваленьня жанчыны. Зроблены толькі першыя крокі. Але мы глыбока ўпэўнены, што працоўная жанчына пад кіраўніцтвам кампартыі, хуткім крокам пойдзе і прыдзе да лепшай будучыні.

У. ІГНАТОЎСКІ.

РАБОТНІЦЫ І СЯЛЯНКІ ВЫКОНВАЮЦЬ ВЯЛІКУЮ ПРАЦУ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

ТАВАРЫШЫ РАБОТНІЦЫ І СЯЛЯНКІ!

Да дзесяцігодзьдзя жаночага аддзелу нельга не адзначыць тэй гэраічнай і важнай працы, якую вы прарабілі разам з рабочаю клясаю, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі. Вы самаахвярна біліся за ўладу саветаў, за пралетарскую дыктатуру, супроць буржуазеі і абшарнікаў. Вы, таварышы работніцы і сялянкі, у час грамадзянскай вайны поруч з мужчынаю паказалі вялікія ўчынкі і адвагу ў барацьбе з контррэвалюцыяй, вынося голад, холад і розныя нявыгоды.

У пэрыяд нашага сацыялістычнага будаўніцтва работніца і сялянка выконвалі вялікую працу на фронце перамогі нашае прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Дзесяць год не прайшлі дарэмна: у выніку напружанай працы працоўная жанчына сапраўды заняла адпаведнае месца ў нашым Саюзе. Гэта відаць з таго, што мы ўжо маем шэраг вылучэньняў жанчын на самыя адказныя пасады ў партыйных, савецкіх, гаспадарчых, прафсаюзных і інш. арганізацыях.

За дзесяць год посьпехі вельмі вялікія. Але поруч з гэтымі дасягненьнямі мы маем цэлы шэраг недахопаў, скажэньняў і недапусьцімых зьявішчаў у нашай працы.

Вынікі за дзесяць год павінны выявіць усе дасягненьні і нашы нездаровыя месцы, а таксама даць напраман у далейшай працы на бліжэйшыя гады.

Вітаючы вас, работніцы і сялянкі, з дзесяцігодзьдзем жаночага аддзелу, жадаю вам далейшых посьпехаў у творчай працы па сацыялістычнаму будаўніцтву.

Работніца, сялянка! З павялічанай у дзесяць разоў энэргіяй за працу ў справе індустрыялізацыі краіны! За калектывізацыю сельскае гаспадаркі! На фронце барацьбы—за культурную рэвалюцыю!

Вырывайце з карэньнем усе перашкоды, якія стаяць на шляху яшчэ большага ўзмацненьня вашае актыўнасьці ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Старшыня ЦСПСБ РЫЖОЎ.

Матар'ялы для дакладу аб дзесяцігодзьдзі 1-га зьезду работніц і сялянак*)

5. Перашкодай у справе большага прыцягненьня працоўных жанчын да будаўніцтва сацыялізму зьяўляецца ня толькі іх бытавое становішча, але ўсё яшчэ адсталы культурны ўзровень іх разьвіцьця, малапісьменнасьць і няпісьменнасьць. Ленін прыдаваў вялікае значэньне рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці працоўных. Ён гаварыў, што няпісьменны чалавек стаіць па-за палітыкай. Праўда, за 10 год, якія мінулі з 1-га зьезду жанаддзелу, навучана грамаце 3 мільёны дарослых жанчын, аднак, сярод 10 мільёнаў усіх няпісьменных жанчын да гэтага часу складаюць: 62,9 проц. Па БССР на 1-І—27 г. усіх няпісьменных было 2.954.759, з іх жанчын 837.405, прычым у горадзе іх 170.340, у вёсцы 1.667.065. Пагэтаму нашым практычным лёзунгам да дзесяцігодзьдзя з дню 1-га зьезду работніц і сялянак павінен быць: ліквідацыя няпісьменнасьці і павышэньне культурнага ўзроўню сярод жанчын у масавым маштабе.

Працоўныя жанчыны абслугоўваюцца ўсімі відамі і формамі культуры й работы; у вёсцы хаты-чытальні вядуць работу сярод сялянак, вылучаючы «дні сялянкі», арганізуючы «куткі» і прыцягваючы сялянку да работы ў гуртках. Наглядаецца цяга сялянкі да сельска-гаспадарчых ведаў і працы ў сельска-гаспадарчых гуртках.

Побач з гэтым яшчэ шмат несьвядомасьці, цемры, адсталасьці, рэлігійных забабонаў, адзічаласьці, п'янства ў нашым быту, асабліва на вёсцы. Ад усяго гэтага церпіць больш за ўсіх жанчына. Ад зьнішчэньня ўсяго гэтага зла залежыць культурны ўздым жанчыны. Бяз нашчаднай барацьбы са ўсімі гэтымі балячкамі нашага быту немагчымы культурны ўздым работніцы і сялянкі. Барацьба за пісьменную работніцу, батрачку і сялянку, за ўзмацненьне работы па абслугоўваньні культурных патрэб працоўнай жанчыны, за культурную рэвалюцыю— вось наш лёзунг у дзесятую гадавіну жанаддзелу.

6. Грунтоўнай формай палітычнага выхаваньня і падрыхтоўкі працоўных жанчын да грамадзкай працы зьяўляюцца дэлегацкія сходы работніц і сялянак, якія былі складзены па ўсяму СССР у 1919 годзе. У БССР дэлегацкія сходы пачынаюць працаваць у 1920 годзе. Праз іх партыя прыцягвае шырокія колы працоўных жанчын да ўдзелу ў правядзеньні пастаўленых перад краінай задач. Праз дэлегацкія сходы па СССР прайшло каля 2.500 тысяч работніц і сялянак. У часы грамадзянскай вайны, у часы голаду і гаспадарчага разбурэньня дэлегаткі са ўсёй рабочай клясай прымалі ўдзел у барацьбе з голадам, бандытызмам, працавалі на суботніках і ваксрэсьніках. На БССР мы пачалі ў 1920 годзе работу з 332 дэлегаткамі, а ў 1927-28 г. мы маем 73 дэлегацкія сходы з 4627 дэлегаткамі-работніцамі; да канца году засталося 67 дэлегацкіх сходаў і 3137 дэлегатак, з іх у практычную работу саветаў, прафсаюзаў, каапэрацыю і г. д. уцягнута 2235 чал.

У вёсцы ў 1927-28 г. было 792 дэл. пунктаў і 23464 дэлегаткі (у мінулым годзе 684 дэлегацкіх пунктаў і 22981 дэлегатка).

І ў вёсцы дэлегацкія сходы перабудоўваюцца на практычны лад. Большасьць з іх маюць мэтавую ўстаноўку, выконваць адпаведную практычную работу. Дэлегаткамі арганізоўваюцца паказальныя гароды, сельгасп. арцелі, ясьлі, дзіцячыя пляцоўкі і г. д. З агульнай колькасьці 23464 дэлегатак на вёсцы ўцягнута ў грамадзкую работу 7566.

У сувязі з задачамі, якія ў сучасны момант стаяць перад партыяй і савецкай уладай, дэлегаткі ўцягваюцца ў самакрытыку, у барацьбу з бюракратызмам і дэлегаткі актыўна дапамагаюць савецкай уладзе ў правядзеньні хлебазагатовак, у арганізацыі вясковай беднаты, у гуртаваньні бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі для наступу на кулака; за дэлегаткамі ідзе маса работніц батрачак і сялянак—бядначак і серадначак. Праз дэлегацкія сходы ў практычную работу ўцягваюцца таксама і жонкі рабочых, хатнія гаспадыні і саматужніцы.

Усё-ж яшчэ шмат недахопаў у практычнай рабоце дэлегатак. Асабліва слаба яны ўдзельнічаюць у рацыяналізацыі вытворчасьці, у вытворчых нарадах, яшчэ недастаткова іх роля, як грамадзкай адзінкі на вёсцы. Мала ўвагі з боку адпаведных прафсаюзных, савецкіх, каапэрацыйных і інш. арганізацый да работы прымацаваных дэлегатак.

Да 10-й гадавіны жанаддзелаў мы павінны паставіць задачу—шырэй разгарнуць сетку дэлегацкіх пунктаў, значна павялічыць колькасьць дэлегатак, і асабліва ў вёсцы, падняць якасьць вучобы дэлегатак, больш увагі іх практычнай рабоце, прыцягнуць масу работніц у вытворчыя нарады, масы сялянак у работу па каапэраваньню, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, у работу па паляпшэньню пастаноўкі справы ў установах, утвораных для вызваленьня жанчыны, у работу па ўтварэньні сотняў новых такіх устаноў, у барацьбу за культурную рэвалюцыю.

7. Друк зьяўляецца важнай зброяй клясавай барацьбы, арганізатарам і выхавацелем рабоча-сялянскіх мас, адыгрывае таксама вялікую ролю ў арганізацыі і выхаваньні жаночых мас. У СССР ёсьць 18 жаночых часопісаў, з якіх 10 масавых, у тым ліку наша масавая часопісь на беларускай мове «Беларуская Работніца і Сялянка». Рост жаночага друку гаворыць аб вялікім зруху ў культурным росьце шырокіх жаночых мас. Рабселькорак у агульнай прэсе ў 1927 г. было больш 20 тысяч, з іх рабкорак каля 13 т., селькорак звыш 8 тысяч. У часопісі «Работніца і Сялянка» ўдзельнічае больш 360 рабкорак і селькорак. Наша далейшая задача—больш работніц і сялянак у рабселькораўскую армію барацьбітоў з балячкамі нашага гаспадарчага будаўніцтва, з балячкамі нашага быту, з бюракратызмам, нядбайнымі адносінамі да справы. З арміі рабселькорак неабходна выхаваць здольных працаўнікоў у галіне далейшага вызваленьня жанчыны.

8. Цяжкія бытавыя ўмовы, адсталасьць і забабоны часта перашкаджаюць уступленьню працоўнай жанчыны ў шэрагі перадавога атраду рабочае клясы партыі. Да Кастрычнікавае рэвалюцыі ў нашу партыю ўступалі найбольш загартаваныя работніцы, якія сьвядома ішлі ў шэрагі перадавых барацьбітоў рабочае клясы, афяроўваючы сябе на турмы, катаргу, ссылку. З Кастрычнікавай рэвалюцыі пачаўся сыстэматычны рост ліку работніц і найбольш сьвядомых сялянак з бядняцак і батрачак у партыі. У 1922 годзе ў партыі было 3993 жанчыны або 7,8 пр. да агульнага ліку членаў партыі; у 1927 г. ужо ёсьць 137430 жанчын, або 12,9 проц. з іх 64783 работніцы і 13175 сялянак.

Лік членаў і кандыдатаў КП(б)Б на 1-V-28 г.—3847, пры чым работніц ад варштату і батрачак 1557, сялянак—352.

Наша задача праз усю нашу сыстэму ўцягваньня жанчын у грамадзкую працу, асабліва праз дэлегацкія сходы, узмацніць вэрбоўку работніц, батрачак і сялянак-бядначак у партыю.

9. Вялікую работу давялося праробіць партыі, каб выпрацаваць у перадавым пласьце працоўных жанчын упэўненасьць у сваіх сілах, разуменьне неабходнасьці і актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве. Да 10-й гадавіны з дню 1-га зьезду ў гэтай галіне ёсьць вялікія дасягненьні. Шмат рабочых ведаюць і шануюць жанчын-майстроў, якіх вылучыла маса работніц; у вёсках ведаюць і паважаюць дзелавых сельсаветчыц, здольных старшынь сельсавету. 23 чэрвеня 1928 г. ЦК УсеКП(б) прыняў пастанову аб вылучэньні жанчын-камуністак, асабліва работніц на самастойную работу ў губэрнях, вобласьцях у якасьці сакратароў губкомаў, старшынь губвыканкомаў, і губпрафсаветаў, у калегіі Наркаматаў, у прэзыдыумы ЦК прафсаюзаў і г. д. Сваю пастанову ЦК разглядае як «пачатак назрэўшага сур'ёзнага зруху ў справе шырокага вылучэньня жаночых камуністычных, а таксама беспартыйных кадраў, асабліва з работніц, на самастойную кіраўнічую працу ў партыйных арганізацыях, прафсаюзах, саветах і г. д.» У сувязі з гэтай пастановай мы маем некаторую лічбу жанчын—старшынь выканкомаў, членаў калегіі Наркаматаў, сакратароў партарганізацый. У Беларусі мы маем жанчын на кіраўнічай рабоце ў якасьці старшыні гарсавету ў Гомелі, намесьнікам Наркамправа, члена калегіі Наркамасьветы, вылучэнца член калегіі Наркам'юсту, два старшыні ЦП саюзаў, 5 сакратароў ЦП саюзаў. На мясцох ёсьць цэлы шэраг мясцовых вылучэньняў па ўсіх галінах работы.

Шырокая жаночая маса павінна ведаць сваіх вылучэнак і змагацца з няправільнымі адносінамі да вылучэнак работніц. Работніцы і сялянкі павінны падтрымаць сваіх вылучэнак і дапамагаць ім у рабоце.

10. Работніцы і сялянкі БССР з напружанай увагай сачаць за разгортваньнем барацьбы працоўных усіх краін з капіталістычным ладам. Міжнародным жаночым пралетарскім рухам кіруе міжнародны Жаночы Сакратарыят пры Камінтэрне, на чале якога стаіць Клара Цэткін. Нашы братэрскія кампартыі таксама арганізуюць жанаддзелы. За апошнія гады ў шэрагу краін Захаду і Ўсходу па нашаму прыкладу прыступілі да арганізацыі дэлегацкіх сходаў. Сьвядомыя пралетаркі ўсіх краін супольна са ўсёй рабочай клясай вядуць барацьбу з надыходзячай небясьпекай вайны супроць СССР.

Асабліва важная роля ў гэтай барацьбе супроць вайны з СССР работніцы і сялянкі Заходняй Беларусі і Польшчы, якія знаходзяцца на мяжы паміж краінай дыктатуры пралетарыяту і капіталістычным сьветам.

У дзесятую гадавіну жанаддзелу работніцы і сялянкі БССР шлюць ім сваё шчырае рэвалюцыйнае прывітаньне і заклікаюць іх да барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, якая нясе з сабой поўнае вызваленьне працоўнай жанчыны.

Работніцы і сялянкі БССР разам са ўсімі работніцамі і сялянкамі СССР ведаюць аб небясьпецы вайны і супольна са ўсімі працоўнымі рыхтуюцца да абароны СССР і сваіх кастрычнікавых заваёў. Удзел працоўных жанчын у рабоце ТДА-Авіяхіму дасягае 24.700 чалавек, у гуртках Чырвонага Крыжу—18694 чал.

Дзесяцігодзьдзе жанаддзелу супадае з другім дзесяцігодзьдзем - дзесяцігодзьдзем агалашэньня Беларускай Савецкай Рэспублікі; разам са ўсімі працоўнымі работніцы і сялянкі БССР у 10-ю гадавіну агалашэньня БССР падагуляць вынікі нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, намецяць далейшыя задачы па індустрыялізацыі, калектывізацыі савецкай гаспадаркі.

11. За 10 год з дню скліканьня 1-га зьезду работніц, працоўныя СССР прашлі вялікі і цяжкі шлях ад грамадзянскай вайны, разбурэньня і голаду—да поўнай адбудовы прамысловасьці, значна паднялі сельскую гаспадарку, прыступілі да індустрыялізацыі краіны, правядзеньня сямігадзіннага рабочага дню. Перад намі стаіць задача дапамагчы партыі ў рэканструкцыі прамысловасьці і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі на новай тэхнічнай базе, арганізацыі калгасаў і буйных хлебных фабрык—саўгасаў.

Задачы, якія стаяць перад партыяй і савецкай уладай за мінулыя 10 гадоў, былі пасьпяхова вырашаны ў значнай ступені дзякуючы актыўнаму ўдзелу работніц і сялянак. Новыя задачы, якія стаяць перад партыяй і савецкай уладай, таксама будуць пасьпяхова вырашаны: ужо ня сотні, а міліёны жанчын прымаюць удзел у распачатай камуністычнай партыяй і савецкай уладай вялікай справе вызваленьня працоўных. Ажыцьцяўляецца на справе наказ Леніна: Ніякія варожыя сілы ў іншых краінах і ўнутры СССР ужо ня страшны першай у сьвеце рэспубліцы працоўных.

АПА і Аддзел Работніц і Сялянак ЦК КП(б)Б.

*) Гл. «Сав. Бел.» № 275.

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Хібы ў загатоўцы лёну.

(Гутарка з інспэктарам Наркамгандлю СССР т. Шэянсонам).

Загатоўкі валакна і семя лёну ў Віцебскай і Полацкай акругах рэзка адстаюць ад загатовак іншых акруг БССР. Па кантрактацыі таксама назіраецца вельмі рэзкае адставаньне, асабліва ў Полацкай акрузе, дзе амаль нічога яшчэ не сабрана. Пры аб'езьдзе Полацкай і Віцебскай акруг высьветлілася, што ў Полаччыне асноўная праца ўсёй загатоўчай кампаніі—барацьба загатоўчых апаратаў паміж сабой. Нізавы загатоўчы апарат (прыёмшчыкі і пакупнікі) у шэрагу месц складаецца з чужога нам элемэнту. Зафіксаваны выпадкі, калі сялянам плацяць за сыравіну ніжэй цэн, якія вызначыў урад. Ёсьць нават выпадак спайваньня селяніна (Дрыса) пакупніком, каб атрымаць сыравіну таньней. Практыкуюцца таксама спосабы сямейнай расплаты з сялянствам: пакупнік выплачвае селяніну з кішэні бяз квіткоў па свайму погляду, што прыводзіць да разнабою ў цэнах і немагчымасьці кантролю. Гэтыя выпадкі вядомы кіраўнікам акруговых загатоўчых арганізацый, чамусьці ніхто гэтых недарэчнасьцяў ня ліквідуе і бышцам нават патурае гэтаму.

Замест накіраваньня ўсёй энэргіі і ўвагі на ўзмацненьне загатовак—барацьба загатоўчага апарату паміж сабой. Вынікі гэтага ўжо відаць. Каапэрацыя павінна была па кантрактацыі да 25 лістапада сабраць 35 проц., а сабрана толькі 5,6 тон (плян гадавы 1360 тон).

Белдзяржгандаль у Полацку мае апарат у 16 чал., а загатоўлена амаль за два месяцы толькі 2,5 тон з пляну ў 360 тон. Акруговыя кіруючыя арганізацыі мала аддаюць увагі загатоўкам валакна і семя лёну і асабліва збору закантрактаванай сыравіны. Да прыкладу, Дрысенскі райвыканком абмеркаваў пытаньне аб загатоўках ва[лак]на ў апошні раз толькі ў чэрвені. [Лі]чучы, загатоўчай кампаніі [гэт]ага году райвыканком нават не закрануў.

Дырэктывы ўсімі арганізацыямі напісана на некалькі год, але ніхто не правярае, як яны выконваюцца. Між тым загатоўка семя лёну мае для Полаччыны вельмі вялікае значэньне, і загатоўкі ў Полацкай акрузе ў агульным загатоўчым пляне БССР складаюць досыць вялікі процант.

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя з усяго загатоўчага пляну звыш 95 проц. павінна сабраць па кантрактацыі, а ў выніку нічога ёю ня зроблена для ўзмацненьня збору закантрактаванай сыравіны. Каапэрацыйны актыў у працу ня ўцягнуты, растлумачальнай кампаніі сярод лёнаводаў не праведзена. Між тым процант каапэраваньня сялянства ў Полаччыне надзвычайна высокі: 47,9 проц. усіх гаспадарак каапэравана сельска-гаспадарчай каапэрацыяй і 60 проц.—спажывецкай.

На Віцебскай акрузе загатоўкі, асабліва семя-лёну, таксама вельмі слабыя. Неабходна адзначыць, што ў загатоўках па Віцебскай акрузе лічыцца значная колькасьць валакна і семя, якое сабрана ў Смаленскай губ. Да прыкладу, у Колышках 50 проц. загатовак сабрана з раёнаў Смаленшчыны. Тое самае і па Заольшанскаму раёну. Нават у самай Лёзьне 10-15 проц. усіх загатовак сабрана з Смаленскай губ. У Колышках і Заольшы да 60 проц. пайшчыкаў спажывецкай каапэрацыі складаюцца з сялян Смаленскай губ., а Колышанскае с.-г. т-ва да 50 проц. кантрактацыі лёну правяло на тэрыторыі Смаленшчыны. А ў гэты час кіруючыя таварышы з Наркамгандлю БССР, ды ня толькі яны, але і ў Віцебскай акрузе думаюць, што ўся маса загатовак сабрана на тэрыторыі Віцебшчыны і зусім ня ведаюць, што робіцца ў прымежных з Смаленшчынаю раёнах.

Закантрактаваная сыравіна ў Віцебшчыне таксама надзвычайна слаба паступае.

Неабходна зараз-жа спыніць сварку загатоўцаў. Трэба зараз-жа мабілізаваць увагу ўсіх савецкіх і грамадзкіх арганізацый ад верху да нізу па пытаньнях загатовак. Пытаньне збору закантрактаванай сыравіны апрача гаспадарчага, мае яшчэ і палітычнае значэньне. Трэба праверыць падрыхтаванасьць загат. апарату да ахопу рынку, трэба правесьці праверку выкананьня дадзеных кіруючымі органамі дырэктыў. Усе мерапрыемствы павінны быць праведзены зараз-жа. Толькі гэта зможа забясьпечыць выкананьне загатоўчых плянаў.

В. Зайцаў.

Максымальная ўвага лёнаводзтву.

Лічбы па Віцебскай акрузе за апошнія тры гады аб становішчы пасеваў лёну гавораць аб зусім нездавальняючым становішчы лёнаводзтва ў акрузе. Калі ў 1907 годзе пасеўная плошча занятая пад лёнам раўнялася 11,8 пр. усей пасеўнай плошчы, дык у 1926 годзе яна дасягала яшчэ толькі 5,3 проц., а ў 1927 годзе—5,73 проц. і у 1928 г.—6,27 проц.

Таксама нездавальняюча стаіць пытаньне з ураджайнасьцю лёну, напрыклад: у 1905 годзе дзесяціна лёну давала ў сярэднім 21,1 п. валакна, а ў 1925 годзе мы мелі—19,4 пуда, у 1926 годзе— 14,1 п., у 1927 годзе —11,6 п. і у 1928 г.—12 п.

Калі параўнаць ураджай лёну ў 1926 годзе па БССР і іншых раёнах СССР, дык ён у нас стаіць ніжэй: па ільнавалакну на 49 проц. і па ільнанасеньню—на 13,8 проц.

Прыведзеныя даныя гавораць аб тым, што пытаньні лёнаводзтва патрабуюць да сабе максымальнай увагі. Зусім недастатным зьяўляецца цяперашні тэмп разьвіцьця лёнаводзтва, а патаму неабходна распрацаваць шэраг дадатковых практычных мерапрыемстваў, садзейнічаючых фарсіраваньню росту пасеву лёну і павялічэньню яго таварнасьці.

Забесьпячэньне лёнаводаў хлебам, якое праводзіцца Наркамгандлем у гэтым годзе, зьяўляецца адпаведным стымулам у пашырэньні ільнявога кліну, далейшым паглыбленьнем гэтай працы трэба стварыць такія ўмовы, якія гарантавалі-б атрыманьне хлеба лёнаводнымі гаспадаркамі.

Апрача хлебнага пытаньня, якое мае важнейшую ролю ў справе разьвіцьця лёнаводзтва, неабходна таксама праводзіць па лініі зямельных органаў мерапрыемствы паставіць больш выпукла і востра ў лёнаводных раёнах. Трэба прызнаць, што землеўпарадкаваньне ў лёнаводных раёнах ня мае яшчэ належнага тэмпу і неабходнай ударнасьці, ня гледзячы на тое, што дырэктывы ўраду былі дадзены. Неабходна скласьці паасобны плян па БССР землеўпарадкаваньня лёнаводных раёнаў, прадугледзіўшы поўнае сканчэньне работы на працягу бліжэйшых 2-3 гадоў, пачаўшы гэту працу з вясны бягучага году. Трэба павялічыць завоз угнаеньняў, а таксама завоз машын і прылад, у тым ліку машын па апрацоўцы лёну, і павялічыць колькасьць аграномаў у лёнаводных раёнах, паставіўшы шырока аграпрапаганду за пасеў лёну на лепшых глебах.

Неабходна таксама зрабіць пералом у гэтым напрамку ў калектыўных і савецкіх гаспадарках. Буйныя гаспадаркі (саўгасы і калгасы) павінны даваць максымальную колькасьць таварнага лёнавалакна і лёнанасеньня для нашай прамысловасьці і сваёй працай рабіць уплыў на пашырэньне пасеву лёну і падвышэньне ўраджайнасьці ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках.

Разьвіцьцё лёнаводзтва, фарсіраваньне тэмпу гэтага разьвіцьця, падвышэньне таварнасьці лёну павінна зьяўляцца адным з важнейшых пытаньняў у нашай штодзённай працы.

Віцебск. **А. Дзякаў.**

САМААБКЛАДАНЬНЕ ДАПАМОЖА БУДАВАЦЬ НОВУЮ ВЁСКУ.

КАРЫСЬЦЬ САМААБКЛАДАНЬНЯ ВІДАВОЧНАЯ. БЯДНЯЦКАЯ І СЕРАДНЯЦКАЯ ЧАСТКА ВЁСКІ, ПА СВАЁЙ ІНІЦЫЯТЫВЕ, ПРАВОДЗІЦЬ НОВАЕ САМААБКЛАДАНЬНЕ.

Маем добрыя вынікі.

У час правядзеньня самаабкладаньня гр-не с. Танежы вельмі спрачаліся за ўвядзеньне самаабкладаньня. Многія з грамадзян, асабліва заможная частка, выказвала такую думку, што самаабкладаньне непатрэбна.

Але зусім іншае сказалі грамадзяне, калі ў дзень сьвята 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі пашлі ў клюб, які быў нанова адрамантаваны за кошт самаабкладаньня. Грамадзяне былі зацікаўлены і рады новаму клюбу і выказалі сваю думку аб тым, што ня шкода на добрую справу даваць грошы.

Акрамя клюбу за кошт самаабкладаньня ў с. Танежы прывялі ў належны выгляд стары школьны будынак, у якім зрабілі новы дах і двор, абгарадзілі дашчатым плотам.

Пажарнае дэпо, якое працякала і ў якім ржавелі ад дажджу пажарныя машыны, цяпер, дзякуючы самаабкладаньню, мае другі выгляд. Зроблен новы дах і палажана ў пажарным дэпо падлога.

Самая цёмная вёска Танежскага сельсавету Данілевічкі Млынок і тая, дзякуючы самаабкладаньню, мае свой чырвоны куток.

Таксама за кошт самаабкладаньня пабудаваны масты на шляху ў в. Слабада і хут. Салагубава. Цяпер ужо палешукі не ламаюць сваім жывёлам ногі, як гэта было тры месяцы таму назад. 70 рублёў самаабкладаньня па Танежскаму сельсавету пашло на культурна-асьветныя ўстановы.

Трэба сказаць, што, дзякуючы самаабкладаньню, грамадзяне Танежскага сельсавету ўбачылі, што грошы іх пашлі на іх-жа карысьць. І бачаць, што яшчэ трэба шмат чаго зрабіць новага, і гэта можна выканаць толькі пры дапамозе самаабкладаньня.

С. Шаўковіч.

Тураўскі раён, Мазырскае акругі.

Аднагалосна рашылі правесьці самаабкладаньне.

(Вульскі раён, Полаччына).

У в. Зуі, Вобальскага сельсавету пашлі праводзіць кампанію па надпісцы на 2 пазыку індустрыялізацыі.

Пагутарылі, падпісаліся.

Пачалі сяляне гаварыць аб сваіх бедах, пачалі крыўдзіцца, што вёскай цяжка што-небудзь зрабіць. Успамянулі аб калектыве, некаторыя—за, некаторыя—супроць, наогул—хістаньне, а гэта значыць ёсьць зрух у лева, у бок калектывізацыі.

Аб калектывах рашылі гаварыць яшчэ, прыйсьці ў другі раз...

Бяда ў сялян в. Зуі: вада затапляе палі, хоць палі і высокія, але жыта, якое нам так патрэбна, вымакае, гіне. А рады няма: цяжкія на пад'ём зуеўцы; грязь з вуліцы ў хату чуць не цячэ.

Тут ім і растлумачылі, што ў такіх выпадках дапамога адна—самаабкладаньне.

Аднагалосна рашылі правесьці самаабкладаньне на 35 проц. падатку. Беднякі, якія звольнены ад падатку, уласнай сілай згадзіліся прыняць удзел у працы, адпаведна колькасьці сваёй зямлі. Бядняк з серадняком рашылі ў шчыльнай згоднасьці; заможныя, бачачы такую згоду, маўчалі.

Вобальская ШСМ дапаможа агранамічным пэрсаналам—і праца пачынаецца зараз.

А. М—кі.

Самаабкладаньне на школу.

Віцебск, 30-XI. Насельніцтва Выдрэйскага сельсавету, Высачанскага раёну для таго, каб капітальна адрамантаваць Выдрэйскую школу, па сваёй уласнай ініцыятыве ў гэтым месяцы правяло сходы, на якіх ухвалілі правесьці самаабкладаньне на 1260 руб. грашыма, якія да 1 студзеня 1928 г. зьнесьці ў сельсавет.

Бедната, вызваленая ад с.-г. падатку, ухваліла частку грошай, якая з іх належыць, адпрацаваць. Гэта яскрава кажа аб тым, што там, дзе сельскія саветы моцныя і зразумелі неабходнасьць самаабкладаньня—сялянства цалкам ідзе ім на сустрэчу.

САМААБКЛАДАНЬНЕ—ШЛЯХ ДА КУЛЬТУРНАГА І ГАСПАДАРЧАГА ЎЗДЫМУ ВЁСКІ.

За праведзенае ў мінулым годзе самаабкладаньне ў Самахвалавіцкім раёне пабудаваны сотні мастоў, адрамантавана 7 школ, распачата пабудова 2 новых школ, адбудаваны вэтэрынарны і мэдыцынскі пункты, набыта 6 пажарных машын, адбудавана 2 пажарных дэпо, пабудавана 8 бэтонных студняў і інш.

Усё гэта зьяўляецца жывым паказчыкам таго, што кулак хлусіў, калі пры правядзеньні гэтае кампаніі ярасна выступаў і даказваў, што гэтых грошай мы бачыць ня будзем, што гэта пойдзе ў дзяржаўную казну на невядомыя сялянству патрэбы. Бедната і серадпякі, якія падтрымлівалі ідэю самаабкладаньня, на факце яшчэ раз пераканаліся ў карысьці самаабкладаньня.

Гэта яшчэ фундамант тых запатрабаваньняў, якія зараз маюцца ў вёсцы. Цэлы шэраг мерапрыемстваў, распачатых за сродкі самаабкладаньня яшчэ не закончаны, а таксама выяўляюцца новыя патрэбнасьці.

Для больш шпаркага заканчэньня распачатых пабудоў неабходна ў гэтым годзе таксама арганізаваным парадкам правесьці самаабкладаньне, якое выклікаецца жыцьцём. Так, напрыклад, у вёсцы Закружка, Крупіцкага с.-с., Самахвалавіцкага р., РВК па жаданьні насельніцтва правёў самаабкладаньне на 28-29 год у разьмеры 35 проц. налічанага падатку на сканчэньне пабудовы школы. Галасаваньне прайшло аднагалосна, пры адным супроць.

Такіх фактаў імкненьня насельніцтва да палепшаньня гаспадарчага і культурнага становішча можна знайсьці вельмі многа, дзеля гэтага адпаведным органам улады неабходна паклапаціцца аб дачы дырэктыў на месцы аб згуртаваньні гэтых імкненьняў навакол адпаведных практычных мерапрыемстваў.

Бедната ў саюзе з серадняком і ў гэтым годзе яшчэ з большай актыўнасьцю дадуць адпор кулацкім процістаўленьням у правядзімай кампаніі.

Бярэце прыклад з закружынцаў, абгаварэце свае патрэбы на сходах сялян у сельсаветах з тым, каб забясьпечыць своечасовасьць і плянавасьць у правядзеньні новых і заканчэньні распачатых мерапрыемстваў.

Аляксейчык.

Самахвалавічы, Меншчына.

Вёска аднаўляецца.

(Случчына).

Усяго па раёну налічана па самаабкладаньню 55677 руб. Да 16-XI з гэтай сумы сабрана 37256 руб. і адраблена на 4020 руб. З сабранай сумы выдаткавана 32723 руб. Сродкі выдаткоўваюцца згодна пастаноў сельскіх сходаў.

Да апошняга часу выдаткавана: на народную асьвету 15177 р., на ахову здароўя—2536 руб., сельскую гаспадарку—1975 руб., камунальную гаспадарку—4085 руб. і шляхавае будаўніцтва—5265.

Найлепш разгорнута праца па пабудове школ-прымітываў, якіх будуецца ў раёне 14 і на якія выдаткавана 14610 р.

Найменш і найгорш скарыстаны сродкі на пажарную ахову, якіх вызначана 6143 руб., з выдаткавана 1120 руб., і на шляхавае будаўніцтва, з якіх скарыстана толькі 5215 р.

Наогул сялянства ў большасьці зразумела карысьць самаабкладаньня і нават у некаторых мясцох праводзіла дадатковае самаабкладаньне.

М—ц.

САКАВІТЫЯ РАСТКІ САМААБКЛАДАНЬНЯ.

(Навасадзкі сельсавет, Койдановскага раёну, Менскай акр.)

З-за ўзгорачку паказалася вёска Крыштафава. Здалёку ўжо відаць, як майстры з заліхвацкаю шчырасьцю, высока ўскідаючы над галавой сякеркі і выгукаючы „гах", глыбока ўядаюцца ў бярвеньні, вырубаючы драчку апошняга вянка зрубу. На доле рыхтуюць кроквы. Падыходжу бліжэй. Гляджу і настаўнік тут.

— Што гэта ў вас будзе?

— Школа!—Гэта вынікі самаабкладаньня вёсак Крыштафава, Марцінавічы і засьценкаў Хмялёўка, Рудоды, сабрана 1151 руб. Будынак разьлічан на 2 камплекты. Грошы цяжка было выкачаць у разьмеры 35 проц. з сумы падатку.

— Але-ж усё роўна гэтых грошай ня хопіць—кажу я,— «Хі, браток, мы яшчэ раз самаабложымся, а школку, як ячка адбудуем.

У Дзямідавічах такса самаабкладаньня не прапалі. Канчаюць будынак 10 на 14 аршын пад пажарнае дэпо. Думаюць скарыстоўваць гэты будынак і пад клюб.

— Эх, і ўдалае мерапрыемства—самаабкладаньне. З нічога, здаецца, ды золата дабывалі—кажуць праламітныя дзямідаўскія пажарнікі.

Далей бягу ў Навасады, спаціўшыся з навасадзкай гары ды проста ў балота-багну ў канцы вуліцы. Каля падмурку чалавекі са два працуюць.

— Няўжо-ж школа за 10 крокаў ад паркаў?

— Яна—кажуць. 5 год будуем, але каб не самаабкладаньне, яшчэ-б год з 5 гніў зруб без страхі. Зруб бышай паркоўна-прыходзкай школы падрублен, накрылі саломай, сталярка зроблена; падмурак і печы канчаюць, застаецца падлогу пакласьці, на якую ўжо дошкі сушацца.

Каб не спазьніцца імчу ў Павусьсе. Прабягаю лясочак і проста ўпіраюся ў рэчку Вусу. Чую на чым сьвет стаіць лаянка сялян, спыніўшыся каля рэчкі з бярвеньнямі на вазох.

— Чаго-ж гэта дзядзькі так разышліся ў сваёй лаянцы — кажу я — надыходзячы да іх.

— Як-жа ня лаяцца, усе вёскі, як вёскі. Усюды тое-сёе адбудавалі за гэта самаабкладаньне, а Павусьсі і сам чорт не разьбярэ, што робіцца. Адны кажуць, што з самай вясны яшчэ сабралі грошай больш сотні рублёў і адаслалі ў РВК, каб будавалі мост (такая ўмова была), другія кажуць, што з калгасу РВК ёсьць паперка ў сельсавет ужо даўно і нават тэрміновая, каб ехалі за лесаматар'ялам, але сяляне ўпіраюцца, ня хочуць—заплаці за дастаўку колькі яны хочуць. І валтузяцца ўсё.

Амаль ня кожны дзень сялянства, пераяжджаючы праз гэта месца, робяць такія рызыкоўныя выкрутасы, што Менскі цырк напэўна пазайздросьціў-бы.

Вось і сонца заходзіць пакуль зьліквідаваўся выдатны кірмаш на р. Вусе. Падкасваюся гэта я вышэй калён ды марш праз рэчку, каб ня і ня бачачы мосту ў праэкце в. Павусься. Падбягаю да кузьні, што ў канцы вёскі. Падвод з пяць па двуколках вейкія бочкі прыкоўваюць.

— Адкуль?

— З вёскі Машніца.

— Няўжо пажарнікі?

— Ага! Што дзіўна табе? Машніцкія ўжо ўзварушыліся. Досыць спаць,—А разбудзіў хто?—самаабкладаньне. Спачатку (пакуль грошы зьбіралі) агідзе, а цяпер мілое. Набылі новенькі пажарны насос, бочкі; вось ужо гатовы і ўсе прылады. А пажарную якую ўдалую арганізавалі, каб ты ба-чыў! На будучы год рыхтуемся пяруадводы ставіць, а то пярун бязлітасна нішчыць наш скарб. Неўзабаве ж і радыё слухаць будзем. Сакавітыя самаабкладаньня расточкі.

У. В.

У Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР

АБ ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРЦЫ.

На апошнім пасяджэньні Эканамічнае Нарады былі разгледжаны пытаньні, якія датычацца лясной гаспадаркі.

Быў заслуханы даклад Лесбелу і НК РСІ аб становішчы лясной прамысловасьці; паколькі лясная прамысловасьць БССР займае значную долю прадукцыі прамысловасьці БССР і значную долю лясной прамысловасьці ўсяго Саюзу, а таксама скарыстоўвае асноўнае багацьце БССР—належная пастаноўка гэтае галіны прамысловасьці набывае вялізнае значэньне.

Эканамічная Нарада адзначыла, што ў 1926-27 г. некалькі павялічыўся сабекошт лясной прадукцыі, але ў 1927-28 г. наступіў пералом, і сабекошт зьнізіўся на 2,08 проц.; таксама было адзначана, што Лесбел ня выканаў дырэктыў ураду аб 20 проц. зьніжэньні гаспадарча-адміністрацыйных выдаткаў.

Эканамічная Нарада прызнала, што для ажыцьцяўленьня далейшага зьніжэньня сабекошту і палепшаньня прадукцыі лясной прамысловасьці трэба ў далейшым канцэнтраваць лясную прамысловасьць рэспублікі праз далейшае скарачэньне ліку загатоўцаў. Гэта знайшло адбітак у разьмеркаваньні лесасек на 1928-29 г., паводле якога лік лесазагатоўцаў скарочаны, і каля 62 проц. усяго водпуску лесу прыпадае на Лесбел.

Далей, для ўнясеньня поўнасьці ў дастаўцы драўніны, Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным перагледзець лік працуючых прадпрыемстваў па дрэваапрацоўчай прамысловасьці, каб устанавіць цвёрды лік прадпрыемстваў, забясьпечаных драўнінай і эканамічна карысных, а таксама зьвысіць шматлікасьць у кіраўніцтве гэтымі прадпрыемствамі.

У першую чаргу трэба правесьці замацаваньне лесасек за заводамі, каб больш поўна забясьпечыць іх патрэбу ў сыравіне, у пляне водпуску лесу на 1928-29 г., зацьверджаным Эканамічнаю Нарадаю, у першы раз праводзілася замацаваньне лесасек у доўгатэрміновае карыстаньне.

Адначасова прызнана неабходным правесьці ўпарадкаваньне капітальнага будаўніцтва і працягваць рэканструкцыю лясной прамысловасьці БССР, і што самае галоўнае, забясьпечыць масавы ўдзел рабочых і служачых у вырашэньні пытаньняў аб зьніжэньні сабекошту, палепшаньні якасьці прадукцыі і правядзеньні рэжыму эканоміі.

Каб зьнізіць сабекошт прадукцыі лясной прамысловасьці, палепшыць якасьць яе і больш поўна ўпарадкаваць лясную прамысловасьць, Эканамічная Нарада, бяручы пад увагу, што большая частка лесу перадаецца Лесбелу ад іншых лесазагатоўцаў, запрапанавала яму, каб кошт яго распрацоўкі быў ня больш, як у раўнейшых лесазагатоўцаў. Таксама прызнала мэтазгодным, каб з 1929-30 г. Лесбелу былі перададзены распрацоўкі лесу ў басэйне р. Дзьвіны і, такім чынам, была-б праведзена поўная канцэнтрацыя прамысловай перапрацоўкі лесу.

Каб лепш сачыць за якасьцю лясной прадукцыі, НК Гандлю запрапанована распрацаваць пытаньне аб арганізацыі дзяржаўнага інстытуту лясных бракераў.

ВСНГ і НКЗему даручана больш поўна забясьпечыць лесаматар'яламі мясцовае насельніцтва і мясцовую гаспадарку, а Лесбелу даручана зрабіць захады да максымальнага павялічэньня экспарту, пераважна ў апрацаваным выглядзе.

Апроч таго, ВСНГ запрапанавана вывучыць рынак збыту другагадных асартымэнтаў лясной прадукцыі, і прадукцыі вызначанай да арганізацыі новых прадпрыемстваў; прызнана неабходным зрабіць усе захады для забясьпечаньня капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі лясной прамысловасьці паводле пяцігодкі.

Адпаведным арганізацыям даручана распрацаваць пытаньне аб скарыстаньні Бярэзінскай воднай сыстэмы, узмацніць работу па механізацыі распрацоўкі лесасек і ў прыватнасьці наконт лесавозных чыгуначных ветак.

Таксама было разгледжана пытаньне аб загатоўцы дроў і дастаўцы іх насяленьню.

Паводле дакладу ўпаўнаважанага Эканамічнай Нарады па дрэвазагатоўках, рабочай каапэрацыяй БССР заключаны дагаворы на дастаўку ў 1928-29 г. 337 т. к. м. дроў,—што складае каля 52,6 патрэбы гарадзкога працоўнага насяленьня, а на 1929-30 г. мяркуецца заключыць дагаворы на дастаўку 452 т. к. м. дроў—70 проц. усяе патрэбы ў дровах. Такім чынам, да 1929-30 г. амаль што ўся патрэба працоўнага насяленьня ў дровах будзе здавальняцца праз рабочую каапэрацыю.

Вытворчая праграма па дрэвазагатоўках на 1927-28 г. асноўнымі лесазагатоўкамі ўвогуле была выканана, але некаторыя лесазагатоўцы ня выканалі сваіх праграм; таксама наглядалася адсутнасьць належнай арганізацыі вывозкі дроў з лесу. Таму Эканамічная Нарада абавязала ўсіх лесазагатоўцаў зрабіць захады да своечасовай вывазкі дроў і запрапанавала зьвярнуць увагу на палепшаньне якасьці адпускаемых дроў і ўмовы разьліку за дровы.

Апроч таго, упаўнаважанаму па загатоўцы дроў і НК Гандлю даручана распрацаваць пытаньне аб зьніжэньні на 28-29 г. сабекошту дроў.

АБ ЛЁНА-ПЯНЬКОВЫМ КАМІТЭЦЕ.

Эканамічнаю Нарадаю было прынята палажэньне аб лёна-пяньковым камітэце пры Эканамічнай Нарадзе.

На гэты камітэт ускладаецца кіраваньне лёна-пяньковай справай у БССР, у прыватнасьці, устанаўленьне плянаў пасеву, дастаўка чыста-гатунковага насеньня і мінэральных угнаеньняў, устанаўленьне стандартаў лёну, палепшаньне метадаў апрацоўкі лёну і, наогул, навукова-дасьледчая работа ў гэтай галіне.

Камітэт складаецца з прадстаўнікоў зацікаўленых ведамстваў.

Старшынёю камітэту назначаны тав. Сасноўскі.

Буйны рост прамысловасьці.

(Пяцігодка прамысловасьці ВСНГБ).

ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ — НА 600.000.000 РУБ.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ВСНГБ былі заслуханы даклады аб пяцігадовым пляне разьвіцьця рэспубліканскай прамысловасьці. Згодна другога варыянту пяцігодкі, валавая прадукцыя па нязьменных цэнах павялічыцца да канца пяцігодзьдзя на 416,5 проц. У абсалютных лічбах прадукцыя ў 1932-33 годзе дасягне 600.000.000 р. (па цэнах 1926-27 г.)

Максымальнае разьвіцьцё на працягу пяцігодзьдзя атрымаюць наступныя галіны прамысловасьці: тарфяная павялічыцца ў 24 разы, асноўная хемічная—у 21 раз, тэкстыльная—у 14 разоў, панчошна-трыкатажная—у 27 разоў, швейная—12 разоў. Значнае павялічэньне прадукцыі дасьць мэталёвая, керамічная, скурана-абутковая і харчовая.

КОЛЬКАСЬЦЬ РАБОЧЫХ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА НА 40.000 ЧАЛ.

У зьвязку з такім інтэнсыўным ростам валавай прадукцыі адначасова павялічваецца колькасьць рабочых. Да канца пяцігодзьдзя колькасьць рабочых дасягне 66.000 чал. (без будаўнікоў і рабочых лесазагатовак). За ўвесь гэты час у прамысловасьць будзе ўцягнута звыш 40.000 чал. рабочых.

Побач з гэтым пяцігадовы плян разьвіцьця прамысловасьці праектуе павялічэньне зарплаты на 27,5 проц. Найбольшае павялічэньне зарплаты вызначаецца на адсталых галінах прамысловасьці: тэкстыльнай, папяровай, сярніковай і інш.

САБЕКОШТ ПРАДУКЦЫІ ЗЬНІЖАЕЦЦА НА 25 ПРОЦ.

Увядзеньне ў эксплёатацыю новых прадпрыемстваў, значнае пераабсталяваньне існуючых прадпрыемстваў, лепшае скарыстаньне ўсіх магчымасьцяў дасьць добрыя ўмовы для павышэньня вытворчасьці працы, якая за пяцігодзьдзе павялічваецца на 113,6 пр.

У зьвязку з аздараўленьнем усяе гаспадаркі прамысловасьці плян вызначае зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 25 проц.

НА КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА—221.000.000 РУБ.

Асноўным мерапрыемствам, якое забясьпечвае разьвіцьцё прамысловасьці ў колькасных і якасных адносінах, зьяўляецца капітальнае будаўніцтва. Усяго ў працягу пяцігодзьдзя на капітальныя работы будзе выдана 221000000 руб. З гэтай сумы на адно толькі новае будаўніцтва мяркуецца адпусьціць 172000000 руб. На гэтыя сродкі будзе пабудавана 128 новых прадпрыемстваў.

ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

На рабочае жыльлёвае будаўніцтва ў беларускай прамысловасьці вызначана 20000000 руб.

Прыбытак ад прамысловасьці за пяцігодзьдзе складае каля 195000000 р.

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў зьнізіць адпускныя цэны на прадукцыю прамысловасьці на 2 проц. за кошт зьмяншэньня прыбытку за пяцігодзьдзе да 150000000 руб.

ЗА ПАШЫРЭНЬНЕ І ЎЗМАЦНЕНЬНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Мінулы год зьяўляецца першым годам шырокай працы па калектывізацыі сельскай гаспадаркі Беларусі. За адзін год вырасьлі 509 калгасаў, дзякуючы чаму лік калгасаў павялічыўся на 122 проц. Практыка працы па арганізацыі калектыўнага земляробства паказала, што мы маем, па-першае, шырокае імкненьне да калектывізацыі з боку батракоў і бядняцка-серадняцкага сялянства, якое ня бачыць добрых гаспадарчых пэрспэктыў ад вядзеньня дробнай індывідуальнай гаспадаркі; па-другое, мы маем шырокія зямельныя магчымасьці дзеля арганізацыі калектыўнага земляробства, а таксама вялікія абшары мэліяраваных балотных зямель, якія прыстасоўваюцца пад калёнізацыю; па-трэцьцяе, нас штурхае на шлях шырокай калектывізацыі і той факт, што мы ўкладаем дзесяткі мільёнаў грошай (а будзем укладаць сотні мільёнаў рублёў) у індывідуальную сельскую гаспадарку і ніякага сельска-гаспадарчага эфэкту ня маем. Тым часам з поўнай адказнасьцю і сьмела можна сказаць, што калі мы належную частку гэтых грошай накіруем на калектыўнае земляробства, дык у бліжэйшыя гады пасьля гэтага атрымаем значны гаспадарчы эфэкт і зьліквідуем існуючыя перабоі ў сельска-гаспадарчых прадуктах і сыравіне, на якія зараз адчуваецца вялікае запатрабаваньне.

Ва ўмовах Беларусі мы маем вялікі рух з боку батракоў і бядняцка серадняцкага сялянства да калектывізацыі, маем зямельныя абшары, на якіх будзем арганізоўваць калектыўнае земляробства, і неабходныя грашовыя сродкі на калектывізацыю. Справа пасьпяховасьці пашыранай арганізацыі новага земляробства залежыць цяпер, галоўным чынам, ад таго, наколькі мы самі здолеем арганізаваць працу па калектывізацыі.

Што перашкаджае разьвіцьцю калектывізацыі, якія прычыны часамі зрываюць новыя і разбураюць існуючыя калгасы, якія асноўныя хваробы ў нашым калгасным будаўніцтве, і што трэба зрабіць, каб зьліквідаваць усе гэтыя прычыны?

Першай асноўнай прычынай у гэтым зьяўляецца поўная адсутнасьць рэгулярнай, сыстэматычнай працы пры арганізацыі кожнага нова арганізуемага калгасу. Некаторыя думаюць, што ўсякі новы калгас магчыма арганізаваць па старой казцы: сёньня разьвярнуць агітацыйна „кавёр-самалёт" нашых мерапрыемстваў (землеўпарадкаваньне, аграпамогу, крэдыт і інш.), і новенькі прыгожы калгас адразу з-над зямлі і выскачыць.

Іншыя думаюць, што раз справа ідзе аб калектывізацыі, дык кожнаму нова арганізаванаму калгасу адразу па ўсіх інстанцыях „прыпісаць" землеўпарадкаваньне, аграпамогу, індустрыялізацыю, племяннае жывёлагадоўства, і ў калгасе адразу ўсё зьявіцца. А ад такіх установак нічога ня выходзіць акрамя суталакі і шуму.

Таму, мне думаецца, што ўсю працу пры арганізацыі новых калгасаў трэба будзе разьбіць па наступных пэрыядах: першым зьяўляецца, галоўным чынам, зіма, калі намі павінна быць праведзена арганізацыйная праца па арганізацыі новых калгасаў; мы іх павінны юрыдычна аформіць, зарэгістраваць і ўключыць у плян землеўпарадкаваньня тэй-жа вясной; другім пэрыядам зьяўляецца вясна і лета, калі павінна абавязкова закончыцца землеўпарадкаваньне ў такі час, каб новы калгас зьнімае засеў на тэрыторыі калгасу. У вясновы-летні пэрыяд калгас строіць будынкі на вызначаных дзеля яго плошчах; трэці пэрыяд пачынаецца з гэтае восені і канчаецца вясеньня наступнага году; за гэты час неабходна скончыць працу па арганізацыі калгасу—пабудову будынкаў, набыцьцё жывога і мёртвага інвэнтару, складаньне арганізацыйна-вытворчага пляну і інш. У адпаведнасьці з вызначанымі пэрыядамі працы па арганізацыі новых калгасаў павінна быць разьмяркована і праца агранома і ўсіх іншых спэцыялістаў. Адпаведна гэтаму трэба рабіць і крэдытаваньне калгасаў.

Я думаю, што калі мы разаб'ём працу па належных пэрыядах, дык гэтым самым мы паладзім і палепшым нашу працу пры арганізацыі калгасаў, ад чаго тэмп сацыялістычнага земляробства толькі пашырыцца.

Другая прычына, якая ставіць над пагрозу арганізацыю і далейшае разьвіцьцё нова арганізаваных калгасаў, зьяўляецца дробнасьць іх зямельнай тэрыторыі (у сярэднім 72 гэкт.). Такая зямельная тэрыторыя ня можа зьявіцца базай дзеля арганізацыі буйнага сацыялістычнага земляробства, і таму зараз-жа паўстае пытаньне аб устанаўленьні аптымальнага разьмеру плошчы калгасу. Такім оптымумам, на думку НКЗ, павінна быць тэрыторыя ад 120 гкт. да 500 гкт. і болей. Гэткай велічыні тэрыторыі калгасу мы павінны дабівацца, галоўным чынам, пры арганізацыі калгасу на землях працоўнага карыстаньня; калі-ж будзе ўтварацца калектыўная гаспадарка на землях калёнізацыйнага фонду, дык яна можа быць і ў некалькі тысяч гэктараў. Такой плошчы над калгасы мы павінны дабівацца, як ідэалу, але-ж калі будуць утварацца дробныя калгасы, дык мы іх павінны падтрымліваць і ўсебакова ім дапамагаць і прымаць усе меры дзеля іх далейшага пашырэньня.

Якімі практычнымі мерапрыемствамі і сродкамі мы будзем мець магчымасьць дабіцца арганізацыі буйных па тэрыторыі калгасаў?

Мы ў сёлетнім годзе пры арганізацыі калгасаў на землях працоўнага карыстаньня ня выходзілі за межы адной землеўпарадкоўваемай вёскі, і таму ўтвараліся калгасы дробныя. Мне думаецца, каб дабіцца большых тэрыторый для калгасаў на землях працоўнага карыстаньня, нам неабходна адразу з некалькіх суседніх вёсак вылучыць групы жадаючых перайсьці да калектыўных форм земляробства. У парадку міжселяннага і ўнутрыселяннага землеўпарадкаваньня выдзеліць ім у адным месцы зямлю і разам з гэтым упарадкаваць астатняе насельніцтва, якое пажадае застацца пры асобліва-індывідуальным землекарыстаньні. Калі мы ўжывём такую камбінацыю па аб'яднаньню груп некалькіх вёсак, ужывём метад міжселяннага землеўпарадкаваньня, дык тады і на землях працоўнага карыстаньня мы будзем мець пэрспэктыву на арганізацыю буйнага калгаснага земляробства. Само сабою зразумела, што на землях калёнізацыйнага фонду мы будзем арганізоўваць толькі буйныя калгасы.

Цяпер паўстае пытаньне—як быць з тымі дробнымі калгасамі, якія ўжо арганізаваны і ня маюць ніякіх пэрспэктыў на сваё пашырэньне? Да гэтага ліку гаспадарак адносіцца значная частка гаспадарак, арганізаваных на землях працоўнага карыстаньня, а таксама і калгасы, арганізаваныя на былых садова-гародных дзяржаўных гаспадарках. На маю думку, ва ўсіх такіх дробных калектыўных гаспадарках, калі яны ня маюць пэрспэктыў для свайго пашырэньня тэрыторыі, неабходна зараз-жа вызначыць арганізацыю буйных садова-гародных і малочных гаспадарак, арганізаваць сад у 30—50 гэкт.; гэта будуць буйныя прамысловыя гаспадаркі з вялікім прыбыткам, і тады, бязумоўна, яны будуць мець багатую пэрспэктыву для свайго разьвіцьця.

Трэцім момантам, патрабуючым практычнага вырашэньня, зьяўляецца ўрэгуляваньне фінансавых укладаньняў у наша калгаснае будаўніцтва. Са ўсёй адказнасьцю можна сказаць, што мы яшчэ да гэтага часу не дабіліся рацыянальнага скарыстоўваньня тых вялікіх сродкаў, якія мы ўкладаем у калектыўнае земляробства. І калі справа працягнецца так і далей, дык можам укласьці дзесяткі мільёнаў рублёў і ня будзем мець ні калгасаў, ні калектыўнага земляробства, а між тым мы ўкладаем вялікія сродкі ў гэтыя новыя формы земляробства. Калгасы арганізуюцца ня толькі дзеля таго, каб задавальняць спажывецкія запатрабаваньні калгасьнікаў, а між іншым ёсьць шмат тэндэнцый, што гаспадарка арганізуецца дзеля задавальненьня толькі з «сваіх» запатрабаваньняў; разам з гэтым бываюць выпадкі, калі доўга-тэрміновы крэдыт, вызначаны на палепшаньне гаспадаркі, расходуецца на спажывецкія патрэбы. Пры такой траце сродкаў у калгасным будаўніцтве ёсьць пагроза, што мы не дабёмся належнага гаспадарчага эфэкту ад гэтага будаўніцтва; аб гэтым мы павінны сыгналізаваць зараз-жа і прыняць рашучыя меры, каб на ўкладваемыя дзяржаўныя сродкі арганізоўваліся моцныя, паказальныя па гаспадарчаму эфэкту, буйныя гаспадаркі, каб яны паказвалі шлях, якім павінна пайсьці ўсё бядняцка-серадняцкае сялянства. Надалей нельга дапусьціць такога становішча, калі за атрымліваемыя ад дзяржавы сродкі адказвае толькі сам калгас, і бываюць выпадкі, што калгас шмат грошай расходуе на спажывецкія патрэбы гаспадаркі, не арганізуе яе, а калі разваліцца,—ня знойдзеш нікога адказнага за прапаўшыя грошы. Мне думаецца, што ў самым пачатку арганізацыі кожнага нова арганізуемага калгасу неабходна дакладна вызначыць, колькі наогул патрэбна сродкаў, улічваючы сюды і сродкі самога насельніцтва, аб'ядноўваемага ў калгас, і колькі патрэбна крэдыту; дасканала вызначыць, на якія гаспадарчыя выдаткі грошы будуць скарыстаны, у якой паступовасьці,—прычым, за іх правільнае скарыстоўваньне адказвае кіраўнік калгасу (старшыня праўленьня разам з праўленьнем) пад непасрэдным наглядам і адказнасьцю раённага агранома, які вызначан дзеля арганізацыі калгасаў. Пры гэтым, як правіла, рашуча трэба будзе правесьці такую палітыку пры нашых крэдытных капітальных укладаньнях у кожны калгас, каб увесь наш укладаемы капітал пайшоў на будынкі, складаныя машыны і прылады, куплю жывёлы, адчыненьне індустрыяльных прадпрыемстваў. Пры такіх умовах у дзяржавы будзе поўная гарантыя, што ўкладзеныя сродкі застануцца за калектыўным земляробствам, і разам з гэтым такі парадак фінансаваньня будзе моцнай гарантыяй супроць распаду калгасаў. Такая палітыка і парадак фінансаваньня гарантуе нас, што там, дзе пройдзе арганізацыя калектыўнага земляробства, яно такім і застанецца і будзе разьвівацца, а пры сучасных умовах у нас гэтай гарантыі няма.

Чацьвертым момантам, патрабуючым свайго выразнага вырашэньня, зьяўляецца цьвёрдая і дакладная ўстаноўка на безумоўнае шырокае разьвіцьцё індустрыяльных прадпрыемстваў у калгасах. У нашых старых калгасах, як толькі яны ўзмацняюцца, пачынаюць зьяўляцца тэндэнцыі да пераходу да індывідуальна-дробных гаспадарак. Чым тлумачыцца такое нарастаньне дробна-буржуазнай ідэалёгіі ў калгасьнікаў, якая расьце амаль паралельна ўзросту гаспадаркі? Пытаньне, па маёму, простае і зразумелае, чаму некаторыя беднякі выбіраюць калгас, як трамплін, пры дапамозе якога магчыма было-б пераскочыць у індывідуальныя серадняцкі. Кожны перайшоўшы ў калгас атрымлівае больш зямлі, чым [у] індывідуальнай гаспадарцы, крэдытная і іншая дапамога большая, чымся індывідуальным гаспадаркам; падатковая палітыка таксама спрыяе хутчэйшаму гаспадарчаму росту. Пры такіх спрыяючых умовах часта калектыўная гаспадарка абсталёўваецца машынамі, прыладамі, жывёлай і іншым, якое мала чым адрозьніваецца ад індывідуальнага сялянскага, і як толькі маемасьці набярэцца столькі, што кожная сям'я можа атрымаць серадняцкую норму маемасьці, пачынаецца гута за разьдзел, пры гэтым завіруху пачынаюць самыя адсталыя элементы. Часамі, па нашаму недагляду, хворым элемэнтам удаецца вычысьціць здаровых, і пасьля гэтага яны аднагалосна рашаюць пытаньне аб пераходзе да індывідуальных форм карыстаньня; былі нават выпадкі, калі тайком расьсяляліся на „чырвоныя пасёлкі", або хутары.

Чым усё гэта тлумачыцца? Па маёму, тут асноўная прычына ў тым, што мы ў калгасах ня ўводзім буйных машын і прылад, не адчыняем індустрыяльных прадпрыемстваў, і рост калгасаў ідзе на ўзроўні сялянскага інвэнтару, які лёгка падзяліць. Спрабуем у калгасе ўвесьці трактар, адчыніць завод, паставіць агнатрывалыя будынкі, правесьці электрыфікацыю, і пасьля гэтага ў самых адсталых элемэнтаў ня будзе зьяўляцца думка аб пераходзе да індывідуальнай гаспадаркі. Акрамя таго, без індустрыялізацыі і электрыфікацыі нашых калгасаў немагчыма будзе ўводзіць там новую вышэйшую тэхніку ў гаспадарку, ператвараць гаспадарку ў сапраўды сацыялістычную. Таму зьяўляецца зусім незразумелым, чаму гэта некаторыя працаўнікі і ўстановы ігнаруюць і не праводзяць індустрыялізацыі ў нашых калгасах; на маёму, неабходна ў абавязковым парадку прымусіць праводзіць палітыку і практычную працу па індустрыялізацыі калгасаў, і самі калектыўныя гаспадаркі павінны выявіць самую шырокую актыўнасьць за адчыненьне індустрыяльных прадпрыемстваў, бо ўжо з практыкі вядома, што лепш за ўсё разьвіваюцца тыя калгасы і саўгасы, у якіх ёсьць такія прадпрыемствы.

Пятым пытаньнем зьяўляецца дасканалае вызначэньне і размежаваньне функцый і абавязкаў паміж рознымі ўстановамі, якія займаюцца калгасным будаўніцтвам. Каля гэтага пытаньня складаліся часам хваравітыя тэндэнцыі, што магло адбіцца на самых мерапрыемствах па калектывізацыі, а між іншым пасьпяховасьць нашай працы будзе ў значнай ступені залежаць ад дружнага кантакту ўсіх устаноў, якія працуюць па калгаснаму будаўніцтву. Да гэтага часу яскрава ня вызначаны і не разьмяркованы функцыі паміж зямельнымі і каапэрацыйнымі ўстановамі, і іх неабходна зараз-жа вызначаць са ўсёй яснасьцю. Былі нават такія тэндэнцыі, каб усю агранамію зямельных устаноў, асабліва памочнікаў раённых аграномаў, якія вызначаны працаваць выключна па калгаснаму будаўніцтву, перадаць Калгассаюзу і гэтым самым ізаляваць зямельныя ўстановы ад калгаснага будаўніцтва, ці паставіць зямельныя ўстановы ў такое становішча, каб яны наогул займаліся калгасным будаўніцтвам. Такі абмяжавана-бюракратычны, вузка - ведамсьцьвенны пункт погляду ня прыняты і ня можа быць прынятым. Усе ўстановы—зямельныя, крэдытныя, каапэрацыйныя—павінны быць прыцягнуты да практычнай працы па калгаснаму будаўніцтву і працаваць у поўным кантакце. Разьмежаваньне працы, мне думаецца, неабходна вызначыць. У такім парадку зямельныя ўстановы праз агранамічны пэрсанал, асабліва праз спэцыяльна вызначаных аграномаў, праводзяць працу, галоўным чынам, па арганізацыі новых калгасаў і іх агранамічнаму абслугоўваньню там, дзе няма куставой аграноміі; яны-ж праводзяць землеўпарадкаваньне, мэліярацыю і іншыя мерапрыемствы; каапэрацыйныя ўстановы праводзяць поўнасьцю каапэрацыйна-арганізацыйнае і гаспадарчае абслугоўваньне калгасаў, займаюцца арганізацыяй новых калгасаў, праводзяць аграабслугоўваньне праз спэцыяльную і куставую аграномію; крэдытныя ўстановы вызначаюць колькасьць крэдыту, парадак крэдытаваньня і ўсё гэта праводзяць такім чынам, каб крэдыт садзейнічаў хутчэйшаму гаспадарчаму ўздыму таго ці іншага калгасу. Усе зьвесткі аб працы па калгасах павінны прадстаўляцца зямельным установам і калгассаюзам.

Я спыніўся на асноўных прынцыпах, але-ж калі іх правесьці, дык зусім выразна будуць вызначаны функцыі ўстаноў, праводзячых працу па калектывізацыі, ад чаго тэмп мерапрыемстваў толькі пашырыцца.

З. Прышчэпаў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

вра назначэньне тав. Мачульскага, Х. В. членам Прэзыдыуму Дзяржаўнае Плянавае Камісіі пры СНК БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе назначыць тав. Мачульскага, Хвёдара Варфаламеева, членам Прэзыдыуму Дзяржаўнае Плянавае Камісіі пры СНК БССР.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

21 лістапада 1928 г. г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о назначении тов. Мачульского, Ф. В., членом Президиума Государственной Плановой Комиссии при СНК БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет назначить тов. Мачульского, Федора Варфоломеевича, членом Президиума Государственной Плановой Комиссии при СНК БССР.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР М. Карклин.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

21 ноября 1928 года г. Минск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

вра забясьпечаньне сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы.

Для забясьпечаньня сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы—Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы ўстанавіць у Доме Інвалідаў ня менш 15-ці месц для інвалідаў працы—сельска-гаспадарчых і лясных рабочых.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства перадаць адну савецкую гаспадарку Народнаму Камісарыяту Працы для арганізацыі сельска-гаспадарчае калёніі для сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы. Народнаму Камісарыяту Працы выдаць для арганізацыі гэтае калёніі пазычкова патрэбную суму грошай.

3. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня па ўзгадненьні з Народным Камісарыятам Працы і Цэнтральным Саветам Прафэсыяльных Саюзаў Беларусі вызначыць некаторую колькасьць пэнсій для старых батракоў, пастухоў і іншых сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, не забясьпечаных пэнсіяй па лініі сацыяльнага страхаваньня, са сродкаў, прадугледжаных на забясьпечаньне старых сялян-беднякоў.

4. Для забясьпечаньня сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы, не забясьпечаных сацыяльным страхаваньнем, запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства выдзеліць з запасных зямельных фондаў зямельныя вучасткі для арганізацыі ў кожнай акрузе па адной арцелі з ліку сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы—і членаў іх сем'яў.

5. Выдаваць арцелям сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы—бясплатна лясны матар'ял з штогодняга ляснога фонду.

6. Народнаму Камісарыяту Земляробства прадугледзіць патрэбныя сумы для адначасовае дапамогі тым сем'ям сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, якія арганізоўваюцца ў сельска-гаспадарчыя арцелі.

7. Беларускаму Сельска-Гаспадарчаму Банку прадугледзіць выдачу на льготных умовах сем'ям сельска-гаспадарчых і лясных рабочых—інвалідаў працы, якія арганізуюцца ў сельска-гаспадарчыя арцелі, патрэбныя крэдыты на арганізацыю сельскае гаспадаркі.

Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы падаць дадатковы каштарыс на арганізацыю сельскіх гаспадарак для інвалідаў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

5 верасьня 1928 г., г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

об обеспечении сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда.

В целях обеспечения сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда—Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Предложить Народному Комиссариату Труда установить в Доме Инвалидов не менее 15 мест для инвалидов труда—сельскохозяйственных и лесных рабочих.

2. Поручить Народному Комиссариату Земледелия передать одно советское хозяйство Народному Комиссариату Труда для организации сельскохозяйственной колонии для сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда. Народному Комиссариату Труда выдать для организации этой колонии взаимообразно необходимую сумму денег.

3. Предложить Народному Комиссариату Социального Обеспечения по согласованию с Народным Комиссариатом Труда и Центральным Советом Профессиональных Союзов Белоруссии установить некоторое количество пенсий для престарелых батраков, пастухов и других сельскохозяйственных и лесных рабочих, не обеспеченных пенсией по линии социального страхования, со средств, предусмотренных на обеспечение престарелых крестьян-бедняков.

4. В целях обеспечения сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда, не обеспечиваемых в порядке социального страхования, предложить Народному Комиссариату Земледелия выделить из запасных земельных фондов земельные участки для организации в каждом округе по одной артели из числа сельскохозяйственных и лесных рабочих — инвалидов труда и членов их семей.

5. Выдавать артелям сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда—бесплатно лесной материал из ежегодного лесного фонда.

6. Народному Комиссариату Земледелия предусмотреть необходимые суммы для единовременной помощи тем семьям сельскохозяйственных и лесных рабочих, которые организуются в сельскохозяйственные артели.

7. Белорусскому Сельскохозяйственному Банку предусмотреть выдачу на льготных условиях семьям сельскохозяйственных и лесных рабочих—инвалидов труда, организующихся в сельско-хозяйственные артели, необходимых кредитов на организацию сельского хозяйства.

Предложить Народному Комиссариату Труда представить дополнительную смету на организацию сельских хозяйств для инвалидов.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

5 сентября 1928 года, г. Минск.

У Беларускай Акадэміі Навук.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ПРЫРОДНЫХ ВЫТВОРЧЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ.

1-га сьнежня склікаецца чарговы пленум камісіі па вывучэньню прыродных вытворчых сіл Беларусі. На пленум запрашаюцца з Ленінграду вядомы геобатанік праф. М. У. Казьмянцоў і батанік Палянская. Ад Беларускай С.-Г. Акадэміі запрашаюцца праф. Афанасьеў, т.т. Рагавы, Кісьлякоў і Мядзьведзеў.

На пленуме будзе заслуханы цэлы шэраг навуковых дакладаў па вывучэньню прыродных багацьцяў БССР.

ЗАПРАШЭНЬНЕ ПРАФ. КАПЛАНА.

У Геолёгічны Інстытут Аддзелу Прыроды і Гаспадаркі запрошаны ў якасьці спэцыяліста па сэлікатнай прамысловасьці вучоны спэцыяліст, праф. Рыгор Абрамавіч Каплан.

ВЫВУЧЭНЬНЕ КААПЭРАЦЫІ.

Пры аддзеле прыроды і гаспадаркі ў пачатку 1928 г. была створана камісія па вывучэньню кааперацыі. Каля гэтай камісіі аб'ядналіся навуковыя працаўнікі розных кааперацыйных установ і кааперацыйнага цэнтру БССР. За гэтыя некалькі месяцаў працы камісія заслухала даклады: «Аб картаграфаваньні калгасаў і кааперацыйных арганізацый БССР», «Аб кааперацыйнай прамысловасьці БССР», «Калгасы БССР і перспэктывы іх разьвіцьця», „Рацыянальная форма спажывецкай кааперацыі“ і інш.

Для вывучэньня гісторыі спажывецкай кааперацыі ўтворана група з 5-ці асоб.

Для вывучэньня накладных выдаткаў у кааперацыі член камісіі т. Белавус экспэдыцыйна праводзіў вывучэньне накладных выдаткаў у малочнай кааперацыі, матар'ял вывучэньня зараз апрацоўваецца. Апроч гэтага, пад кіраўніцтвам т. Яршчука, па праграме ім-жа распрацаванай, праведзена экспэдыцыя па дасьледаваньню ўплыву кааперацыі на стан рынку малочнай гаспадаркі. Экспэдыцыя ахапіла каля 4.000 гаспадарак і 5 малочных арцеляй. Гэтыя матар'ялы даваляюць ня толькі высьветліць пытаньні ўплыву кааперацыі на арганізацыю малочнага рынку і малочнай гаспадаркі, але і вывучыць шэраг балючых праблем, зьвязаных з прапрацоўкай і збытам малочных прадуктаў.

Прэзыдыум пастанавіў увесьці камісію як штатную ўстанову у структуру Акадэміі Навук, вылучыўшы на яе працу адпаведныя сродкі. Улічваючы вельмі важнае значэньне разгортваньня навукова-дасьледчай працы ў галіне вывучэньня кааперацыйнага будаўніцтва, пастаноўлена рэарганізаваць камісію ў катэдру кааперацыі і калектывізацыі.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Менскага гарсавету.

Арганізацыя разгрузачна-пагрузачнага пункту.

Прэзыдыум гарсавету пастанавіў арганізаваць на 701 вярсьце разгрузачна-пагрузачны пункт для дастаўкі сыравіны ўсім лыхаўскім заводам.

Акргандлю і Менсельпрому даручана распрацаваць пытаньне аб арганізацыі така-ж пункту ў Козыраве.

Пабудова дому на 40 кватэр

Прэзыдыум гарсавету пастанавіў пераўступіць Белжылсаюзу 100 тысяч руб. з крэдытаў на камунальнае будаўніцтва на пабудову каменіцы на 40 кватэр. Будаўніцтва каменіцы распачнецца ў гэтым гаспадарчым годзе.

Сельская гаспадарка.

Пэрспэктывы ўзмацненьня вэтэрынарнага абслугоўваньня.

У сувязі з агульнымі мерапрыемствамі па павялічэньню ўраджайнасьці, якія высоўвае Наркамзем, маюць быць ужыты цэлы шэраг мер па паляпшэньню вэтэрынарнай справы. Водлуг гэтага праэкту, у бліжэйшыя 5 год павінны быць ліквідаваны павальныя распаўсюджаньні некаторых эпізоотый. Беларускі Вэтэрынарны Бактэрыёлёгічны Інстытут мае быць рэарганізаваны ў Навукова-Дасьледчы Інстытут па эпізоотолёгіі. Інстытуту будзе даручана вывучэньне пошасных і заразьлівых хвароб с.-г. жывёлы, прыстасаваньне навуковых мэтадаў барацьбы з гэтымі хваробамі і г. д.

Адначасна з гэтым мяркуецца да 1932-33 г. утройчы павялічыць існуючую вэтэрынарную сетку, давёўшы яе да 360 вэтэрынарных доктарскіх вучасткаў.

Пашырэньне экспартнай гародніны.

З наступнага году мяркуецца распачаць пашырэньне экспартных відаў гародніны, як цыбуля, цыкоры ды інш. У 1928-29 г. у розных акругах БССР мае быць праведзена кантрактацыя 350 гэкт. цыбулі. Упяршыню будзе ўведзена культура цыкорыя, галоўным чынам, у Аршанскай акрузе, дзе знаходзіцца фруктова-сушыльны завод.

Зімовыя вакацыі ў ВНУ і тэхнікумах.

Нар. Кам. Асьветы БССР пастанавіў вызначыць зімовыя вакацыі ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, Беларускай Дзяржаўнай С.-Г. Акадэміі, Беларускім Дзяржаўным вэтэрынарным інстытуце, 2 хгадовых пэдагагічных курсах, рабочых факультэтах, у Вячэрнім Рабочым Унівэрсытэце тэхнікумах і палітэхнікумах з 1-га студзеня да 1-га лютага 1928 г.

У пэдтэхнікумах, вопытна-практыкавальных школах пры Унівэрсытэце і прафшколах зімовы перапынак з 1-га да 21-га студзеня 1929 г.

У Беларускім Камуністычным Унівэрсытэце і савпартшколах зімовы перапынак з 1-га студзеня да 15-га лютага 1929 г.

Вялікая зацікаўленасьць да музэйнага кутка „Катарга і ссылка“.

Музэйны куток „Катарга і ссылка“, арганізаваны Беларускім аддзяленьнем т-ва быўш. палітkatаржан і ссыльна-пасяленцаў, карыстаецца вялікім посьпехам. Так, за першы месяц яго існаваньня яго ўжо наведала звыш 2.500 чал. У большасьці музэйны куток наведалі экскурсіі ячэек МОПР'у розных менскіх прадпрыемстваў. Музэйны куток таксама наведваюць экскурсіі вучнёўскай моладзі школ і тэхнікумаў, а таксама экскурсанты-адзіночкі. Для экскурсій музэйны куток адчынен на нядзелях з 12 да 3 гадзін дню і па чацьвяргох—з 7 да 9 гадзін увечары. Для адзіночак музэйны куток адчынен з 7 да 9 гадзін увечары штодзённа, апрача аўторкаў.

Менскі дзень.

— Новае аддзяленьне па вырабу крэслаў арганізавана пры менскай мэблёвай фабрыцы. Месячная выпрацоўка аддзяленьня—100 дзюжын гнутых крэслаў.

— Конкурс на лепшую сэнцыю гарсавету пастанавіў правесьці прэзыдыум Менскага гарсавету.

— Кіно-фільм «Хвоі шумяць»,—вытворчасьць Белдзяржкіно—будзе закончан ў першых лічбах студзеня месяца.

— Усебеларуская арганізацыйная нарада рабочай кааперацыі адчынілася 29-га лістапада ў Менску. На нараду прыбылі 24 дэлегаты з усіх акруг БССР, а таксама прадстаўнікі цэрабсэкцыі з Масквы.

Загатоўкі валакна ідуць здавальняюча.

У ільнаводных мясцовасьцях Магілеўшчыны загатоўка валакна ідзе здавальняюча. У Шклоўскім раёне на 20 лістапада загатовілі: Шклоўскае крэдытнае таварыства 3 тыс. пудоў і Чарнаруцкае—1 тыс. пудоў, адгружаецца 5 вагонаў. У радзе загатоўчых пунктаў адгрузка немажліва з прычыны раздарожжа.

Пракладка трамвайнай лініі.

Учора распачаліся работы па тэрмітнай зварцы рэйкавых стыкаў на Савецкай вул. на вучастку ад вул. Луначарскага да Эльводу. Зараз ужо часткова закончана пракладка трамвайных лініі на Барысаўскаму тракту. Закончана пракладка трамвайных лініі па Савецкай і Маскоўскай вул. ад таварнай МББ чыгункі да Каломенскай.

Субсыдыі прафтэхшколам.

Беларускі «ОРТ» (т-ва па садзейнічаньню працы сярод яўрэяў) асыгнаваў тэхшколам 3700 руб.

З гэтай колькасьці асыгнавана менскай прафтэхшколе швейнікаў—900 руб., гомельскай прафтэхшколе мэталістаў—900 р., гомельскай прафтэхшколе дрэваапрацовачнікаў—1500 руб. і курсам электра-мэханікаў пры гомельскай прафтэхшколе мэталістаў 400 руб.

За злоўжываньне кааперацыйнымі кніжкамі.

Пайшчык Рулькевіч быў улічаны ў перапрадажы купленай у краме ЦРК падашвы. Бюро скаргаў МЦРК пастанавіла зрабіць адзнаку ў кааперацыйнай кніжцы—«кніжка затрымана за перапрадажу тавараў». Вырашана таксама паведаміць аб гэтым факце кааптамісію і мясцком працкалектыву абутнікаў, дзе працуе гр. Рулькевіч.

Антысэміты-хуліганы выключаны з саюзу.

5 хуліганаў - антысэмітаў — Валынец, Плеўко, Позьняк, Строшынскі і Кіраў, якія працавалі на пабудове Унівэрсытэцкага гарадка, выключаны з саюзу і зьняты з працы.

Учора на пабудове Унівэрсытэцкага гарадка адбыўся агульны сход рабочых, на якім пастаноўлена санкцыяніраваць гэту пастанову.

Сёньня адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму ЦК саюзу будаўнікоў, на якім будзе абгаворана справа хуліганаў-антысэмітаў.

Падрыхтоўка трактарыстаў.

У студзені месяцы Наркамземляробства адчыняе пры машынна-апрабавальнай станцыі курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў. На курсы будуць прымацца асобы, пасланыя мэліярацыйнымі таварыствамі, саўгасамі і калгасамі, дзе маюцца трактары. Курсанты будуць утрымоўвацца за кошт арганізацый, якія іх пасылаюць.

Праз гэтыя курсы мяркуецца прапусьціць каля 100 чал.

Адчыненьне рэфарматорыуму для бяспрытульных.

У апошні час у Менску наглядаецца вялікі наплыў бяспрытульных. Апошнія забаўляюцца сталоўкі і грамадзкія месцы.

Для барацьбы з бяспрытульнасьцю сёньня ў Барысаве адчыняецца для бяспрытульных рэфарматорыум (установа для перавыхаваньня бяспрытульных). Бяспрытульныя будуць вылоўлівацца ў вуліц і накіроўвацца ў гэты рэфарматорыум.

Паштовая скрынка.

Кр-цу Шэналаву. Ваша запытаньне аб падзеле зямлі накіравана ў Вярхоўную Зям. Камісію пры Наркамземе для расьсьледаваньня. Па вароце адкажам.

Каплеўскаму Я. „Кліч да селяніна“—ня пойдзе. Зьмясьціце ў насьценнай газэце.

Рабкору 2927. Аб судовых справах можна дасылаць. «Прыміце меры» і інш. довісы будуць друкавацца. «Я адміністратар, усе рабкоры склочнікі» накіравана ў аддзел Бабруйскай АКК і НКЮ.

Аўтарам, допісы якіх пасланы на расьсьледаваньне.

1) «Ткнулі носам—скарапілі», „Сам ня гам і другому ня дам“—Мазырск. РСІ.

2) «Дапаможце атрымаць зарплату»—Магілеўск. акр. РСІ.

3) «Эксплёататар»—Аршанск. акругов. адзд. саюзу с.-гасп. і лясных прац.

4) «Карыстацца тым, што маеш дармовы білет, ня можна»—Наркамгандлю.

5) Аб «Расьнянскім каралю»—пракурору рэспублікі.

ПАМЯЦІ ПРАФЭСАРА М. М. ГАЙДУКОВА.

Пахаваньне праф. М. М. Гайдукова.

Учора а 1-й гадзіне дню адбылося пахаваньне прафэсара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту М. М. Гайдукова. У пахаваньні прымалі ўдзел прафэсары, навуковыя працаўнікі і студэнцтва, у ліку некалькі тысяч чалавек.

Спачувальныя тэлеграмы з прычыны сьмерці праф. М. М. Гайдукова.

З прычыны сьмерці праф. БДУ Мікалая Міхайлавіча Гайдукова, Праўленьне БДУ атрымала ўчора шмат спачувальных тэлеграм ад навуковых установ і навуковых працаўнікоў Саюзу. Атрыманы тэлеграмы з Ленінграду ад Усесаюзнага Інстытуту Прыкладной Батанікі, Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі, Інстытуту Сельскай Гаспадаркі, Беларускага Дзяржаўнага Вэтэрынарнага Інстытуту і ад прафэсара Бэрсенгейма з Масквы.

Выстаўка гарсавету.

Да перавыбарнай кампаніі ў залі акрвыканкому будзе адчынена выстаўка, прысьвечаная 2-х гадовай працы Менскага гарсавету. У выстаўцы прымуць удзел камгас, інспэкцыя аховы здароўя і народнай асьветы.

Вывучаем свой край

Вывучэньне шаўкоўніцтва.

У мэтах вывучэньня пастаноўкі справы шаўкоўніцтва ў БССР арганізавана Беларускае Бюро на чале з т. Зьбіткоўскім.

СНК БССР асыгнаваў 500 руб. на правядзеньне вывучэньня гэтае галіны гаспадаркі.

Выстаўка шаўкоўніцтва на студэнцкай краязнаўчай канфэрэнцыі выклікала вялікую зацікаўленасьць да коканаў, выпладжаных ва ўмовах БССР. Настаўніца Шымковіч (Гомельшчына) за свае экспанаты атрымала прэмію ў 15 руб.

Прыкладны краязнаўчы музэй.

Бабруйскі краязнаўчы музэй зьяўляецца адным з багатых краязнаўчых музэяў у БССР. У музэі знаходзіцца да 4000 розных экспанатаў. Асабліва багаты і разнастойны аддзел прыроды, куды сабрана шмат чучалаў зьвяроў, птушак і інш.

Падрыхтоўка да 10-цігодзьдзя БССР.

Слуцкае раённае краязнаўчае т-ва да 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР рыхтуе да выданьня зборнік „Случчына“. У зборнік уваходзяць матар'ялы аб старажытнасьці краю і дасягненьнях ва ўсіх галінах гаспадаркі і культуры, якіх дасягнуў раён за апошнія 10 год.

Суд.

СЭКРАТАР МЯСЦКОМУ—РАСТРАТЧЫК І АШУКАНЕЦ.

На агульным сходзе супрацоўнікаў працкалектыву „Белларок“ Міхась Рабушка быў абраны сэкратаром мясцкому. Прыняўшы справы, Рабушка запрацаваў: стаў агітаваць за выпіску супрацоўнікамі газэт, зьбіраць падпіску і грошы на газэты.

Супрацоўнікі давяралі Рабушку, як сэкратару, уносілі за падпіску газэт грошы, але прачакаўшы каля 2 месяцаў газэт ніхто не атрымаў.

На запытаньні супрацоўнікаў у Рабушка —калі будуць атрыманы газэты, Рабушка казаў: «пачакайце, газэты будуць на днях».

Аднак праходзілі дні, месяцы, а газэт ня было.

Вылучана камісія па праверцы грашовай справаздачы Рабушка, якая выявіла за Рабушкам растрату за падпіску газэт на суму каля 175 руб.

Сабраныя грошы Рабушка прагуляў, але меў на ўвазе пакрыць іх і распрацаваў вось які плян:

31 мая г. г., у часе адсутнічаньня ў канторы „Белларок“ галоўнага бухгальтара Хаімоўскага—Рабушка залез у яго стол, вырваў з чэкавай кніжкі адзін чэк, запоўніў яго на 500 р., зрабіў на чэку подпісы намесьніка загадчыка працкалектыву Кікоіна і бухгальтара Хаімоўскага і папрасіў супрацоўніка Літвянковіча атрымаць гэтыя грошы, за што і абяцаў Літвянковічу частку грошай, але сумленны Літвянковіч па шляху злачынства не пашоў і чэк адразу панёс і аддаў намвагадчыку працкалектыву Кікоіну.

Далей устаноўлена, што Рабушка, будучы апякуном сям'і забітага супрацоўніка Навасельскага, атрымліваемыя грошы на ўтрыманьне дзяцей Навасельскага прысвайваў грошы сабе, а ў справаздачу прадстаўляў фальшывыя і падложныя рахункі.

Рабушка з пасады сэкратара зьнят і аддан суду.

Справа разглядалася ў Менскім акруговым судзе, які прыгаварыў Міхася Уладзіміравіча Рабушка на адзін год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

К.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

МЕТАЛЁБУДАЎСКАЯ «АКУРАТНАСЬЦЬ».

Селянін в. Лясіны Даманкоўскага сельсавету (Полацкі р.) выпісаў у Віцебскім „Мэтальбудзе“ малатарню-шасьцёрку. Па дагавору „Мэтальбуд“ павінен быў праз тры дні даставіць пакупцу малатарню, але прайшло ўжо некальки тыдняў, а малатарні ўсё няма. Што-ж гэта за ўмова?

Т. Вярз.

ПАТРАБУЕМ СТАЛАГА РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ТАВАРАЎ.

У Крайскім кааперацыве ніколі нельга настаўнікам дастаць дэфіцытных тавараў і мукі. Настаўнікі навакольных вёсак маюць магчымасьць бываць у Крайску толькі адзін раз у тыдзень—у нядзелю, а да нядзелі заўсёды гэтыя тавары разьбіраюць Крайскія жыхары і тыя, якія пасьпяваюць прыехаць раней.

Трэба пакідаць дэфіцытныя тавары і для тых пайшчыкаў, якія ня маюць магчымасьці наведваць краму кожны дзень.

М.

ПАБУДАВАЛІ МОСТ НЯ ТАМ, ДЗЕ ТРЭБА.

Каля в. М.-Настанавічы, Завішынскага с.-с., Плешчаніцкага р-ну на гасьцінцу, які перасякае рэчка, быў калісьці мост. У часе вайны мост спалілі і людзі мусілі аб'яжджаць гэта месца праз другі мост, каля млыну. У канцы мая г.г. паводкамі зьнесла грэблю і каля млыну; возера ўцякло—прышлося пераяжджаць па дну, дзе было возера. Па гэтым шляху возяць і пошту.

Коні і людзі топяцца ў гразі і калечацца.

На дарозе-ж каля пасёлку Ставішча Запольскага с.-с.), дзе была веснавая лужа, пабудавалі мост, у той час, як там лепш было пракласьці трубу, а мост пабудаваць там, дзе праяжджае найбольш падвод.

Падарожны.

А ДЗЕ-Ж ЗЬМЕСТ?

Смалявіцкім райкомам МОПР'у ад Менскага АК МОПР'у быў атрыман пакет, у якім пры распячатаньні нічога не знайшлося.

Цікава, што хацеў сказаць АК сваім канвэртам?

Б. Дзяруга.

«АКТЫВІСТ».

У групе беднаты пры Чырвонаберасьцкім КСУ (Бабр. акр.) састаіць сябром селянін вёскі Салоціна Сысоеў Янка. Сысоеў лічыцца вельмі вялікім актывістам. Пры правядзеньні хлебазагатоўчай кампаніі Сысоеў вельмі агітаваў сялян каб здавалі збожжа ў кааперацыю, а сам сваё збожжа вязе ў Бабруйск і прадае на базары прыватнікам.

Бядняк.

ВОН АШУКАНЦА З КААПЭРАЦЫІ.

У вайсковым лягеры Нова-Барысаву ёсьць ларок Барысаўскага ЦРК. Загадчык ларка вельмі груба адносіцца да пакупцоў-чырвонаармейцаў, адпускае тавар больш „на вока“, чым на вагу.

У мінулым гэты загадчык быў уласьнікам буйнага скуранога заводу.

Пралетарская мятла павінна вымясьці такіх „супрацоўнікаў“ з кааперацыі.

А. Станкевіч.

СЕЛЬСАВЕТ НЯ ВЫКАНАЎ ПАСТАНОВЫ СЯЛЯН.

На самаабкладаньню в. Пруд-Барань (Халопеніцкага р-ну) сабрала каля 200 р. на заводзкога бугая і кныра. Але Баранскі сельсавет замест завод. бугая, купіў простага бугайка за 70 руб., а кныра зусім ня купіў.

Сяляне пытаюцца, чаму-ж ня выконвалена іх пастанова і куды дзеліся іх яшчэ 130 рублёў?

Селянін.

ШАХМАТЫ № 27

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

ЦІКАВЫ МАТ.



Трудна паверыць, што такі мат можа быць у сапраўднай партыі. Аднак-жа гэты мат з партыі іграной у Вене між Крайчыкам і Майерам

Вось партыя.

1 d2-d4, g7-g6, 2 e2-e4, Cf8-g7, 3 Kg1-f3, d7-d6, 4 Cf1-c4, c7-c6, 5 Фd1-e2, Cc8-g4? 6 Cc4:f7+Kp e8:f7, 7 Kf3-g5+Kp f7-e8, 8 Фe2:g4, Cg7:d4, 9 Kg5-e6, Фd8-d7, 10 f2-f4, Kg8 f6, 11 Фg4-h3, Cd4-b6, 12 f4-f5, Kf6:e4, 13 f5:g6, Ke4-f6, 14 Лh1-f1, h7-h5, 15 g6-g7, Лh8-g8, 16 Фh3:h5+Kf6:h5, 17 Лf1:f8+Лg8:f8, 18 g7:f8 Л×.

Дабм партыю іграную ў чэмпіянаце прафсаюзаў СССР.

Бел. Рогаи—Ленінград, чорн. Розэнталь—Менск.

1 d2-d4, Kg8 f6, 2 Kg1-f3, d7-d6, 3 Cc1-f4, Kb8 d7, 4 h2-h3, g7-g6, 5 e2-e3, Cf8.g7, 6 Cf1-c4, 0-0, 7 Kb1-g2, Фd8-e8!, 8 0-0, e7, e5, 9 d4:e5 Kd7:e5, 10 Kf3:e5, d6:e5, 11 Cf4-h2, b7-b5!, 12 Cc4-b3, Cc8 b7, 13 Фd1-e2, c7-c5, 14 c2-c3, Фe8-c6, 15 Kd2 f3, Kf6-d7, 16 Лf1-d1, c5 c4, 17 Cb3-c2, Kd7-c5, 18 Лd1-d2, e5-e4, 19 Kf3-d4, Cg7:d4, 20 c3:d4, Kc5-d3, 21 Cc2 d3, e4:d3, 22 Фe2-f1, b5-b4, 23 f-f3, Cb7-a6, 24 e3-e4, b4-c3, 25 b2:c3, b4:c3, 26 Лd2:d3, c4:d3, 37 Фf1:d3, c3-c2, 28 Лa1-c1, Лf8-c8, 29 Kpg1-f2, Фc6-a4?, 30 a2-a3, Фa4-c4, 31 Kpf2-e2, Лc8-c6, 32 Фd3:c4, Лc8:c4, 33 Kpe2-d3, Лc4-c6, 34 Лc1:c2, Лc6 c2, 35 Kpd3:c2, Kpg8-f8, 36 Ch2-d6+ pf8-e8, 37 Kpe2-c, Kpe8-d7, 38 Cd6 c5, g6-g5, 39 g2-g3? a7-a5, 40 d4-d5, Лa8-a6, 41 Kp c3-d4, Лa6-h6, 42 Kpd4-e5, Лh6:h3, 43 Ce5-f2, h7-h5, 44 f3-f4, h5-h4, 45 g4:h5, g5:h4. Белыя здаліся.

ХРОНІКА.

Заўтра а 7 з пал. гадз. увечары ў клюбе савгандальслужачых А. Каспэрскі зробіць даклад аб 4-м усебеларускім зьезьдзе і апошніх усесаюзных спаборніцтвах у Маскве. Пасьля дакладу—сэанс адначаснае гульні. Лік ігракоў не абмежаваны. Прыносьце ігры.

Апавяшчэньні.

АПА Менакругкому КП(б)Б паведамляе ўсіх таварышоў сяброй Менск. гар. партарганізацыі, запісаўшыхся ў нядзельны Камвуз і жадаючых запісацца, што ў нядзелю 2-XII а 11 гадз. дню ў малой залі клюбу Карла Маркса адбудуцца першыя занятні Нядзельнага Камвузу, на якім усе слухачы будуць азнаёмлены з праграмай і інш. Выдра прачытае лекцыю на тэму: «Тэорыя вытворчых сіл і эканамічных структур».

Усе студэнты Камвузу павінны зьявіцца своечасова, жадаючыя запісацца ў Нядзельны Камвуз, павінны зайсьці ў АПА габінэт (клюб Карла Маркса, уваход з вуліцы Энгельса), дзе будзе праводзіцца запіс у пятніцу і суботу ад 6—11 гадз. увечары.

Зам. Заг. АПА ТАМАШЭўСКІ.

— Сёньня, на карысьць і дапамогу школы Беларускім Дзяржаўным Тэатрам пад кіраўніцтвам Галубка будзе пастаўлена п'еса „Лес Цёмны“ у залі Акрвыканкому а 8 з пал. гадз. увечары.

Кошт білету ад 1 руб. да 25 к. Продажа білетаў каля залі з 12 гадз. дню да пачатку спэктаклю.

У НАВУКОВЫМ Т-ВЕ.

— У нядзелю а 5 гадз. увеч. у фізычнай аудыторыі адбудзецца сход ФІЗ.-МАТЭМ. СЭКЦЫІ, на якім выступяць з дакладамі:

1. Праф. В. МРОЧЭК—«Апэратары і мэтадалёгія»

2. Дац. А. УСЬПЕНСКІ —«Эфэкт рамана»

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Сёньня 1-XII у 8 гадз. 30 хв. заняткі сымфанічнага аркестру.

Запіс жадаючых працягнут.

У нядзелю а 6 гадз. вечара заняткі школы малапісьменных, а таксама палітгуртка для тэхпрацаўнікоў.

А 7 гадз. вечара пасяджэньне праўленьня дому.

Парадак дню:

1) Справаздача заг. бібліятэкі і бібліятэчнай камісіі.

2) Бягучыя справы.

БДВТ будзе пастаўлена п'еса «Пан Сурынта».

Пачатак а 8 з палов. гадз. вечара.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

СУБОТА, 1 сьнежня

ЗАЧЫНЕНЫ СПЭКТАКЛЬ ДЛЯ ЖАНАДДЗЕЛУ.

Пачатак роўна а 8-й гадзіне ўвечары.

Пасьля 3-га сыгналу ўваход у відоўню зачынен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	1) „ДОМ НА ТРУБНОЙ“ у 6-ці частках і заменжная камэдыя 2) „КАХАНЬНЕ І СПОРТ“ у 5-ці частках. Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 45 хв.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.	З аўторка, 27 лістапада Пат і Паташон у новай камэдыі „ВЫДАТНЫЯ ПАДАРОЖНІКІ“ ў 7 частках. 3 сэансы: пач. 1-га ў 7 г.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	Трука-прыгодніцкі кіно-раман у 2-х сэрыях і 4 эпізодах. 2 сэрыі 14 частак у адзін сэанс сэрыі 2 „Паміж жыцьцём і сьмерцю“.
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР».	„НЯМЫ ДРУГ“ драма ў 6 ч. Звыш праграмы кіно-хроніка «Совкино». Пачатак сэансаў а 3 з пал. гадз. удзень.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ

№ 9 „ПОЛЫМЯ“ № 9

Штомесячная беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

ЗЬМЕСТ:

ЦІШКА ГАРТНЫ—Рыгор у Пецярбурзе—з раману «Крыжавыя дарогі»—«Сокі цаліны».
ЯЗЭП ГОРА—«Сьмерць мужа і жонкі Шавдовых»—апавяданьне (пераклад з чэскай мовы М. Пружанскага).
Л. РАДЗЕВІЧ—«Нягоднае»—апавяданьне.
АНДРЭЙ КУРЦІ—(Куршынскі)—«Пракурор Нат»—апавяданьне (пераклад з латвійскай мовы К. Езавітава).
Н. ВІШНЕЎСКАЯ—«Завея»—апавяданьне.
ЯКУБ КОЛАС—«На шляхох волі»—паэма.
А. АЛЕКСАНДРОВІЧ—„Разбойнік Буйтрэ“—верш.
І БЭХЭР—«Вялізарнае абжорства»—верш (пераклад з нямецкай мовы Л. Цьвяткова).
ПАЎЛЮК ТРУС—„Ліст да сястры“—верш.
ВАЛЕРЫ МАРАКОЎ. «Ён адчыніў вакно»—верш.
С. ВАЛЬФСОН праф.—Аб Чэрнышэўскім—рэвалюцыянэры і мысьліцелі.
І. ГЕРЧЫКАЎ.—Філёзофскія ды гістарычныя погляды М. Г. Чэрнышэўскага.
ЗЬМ. ЖАРЫНАЎ праф.—„Прыгонная гаспадарка Беларусі паводле даных расейскай гаспадарчай літаратуры і журналістыкі 30-40 гадоў.
І. ЗАМОЦІН праф.—Драматычныя творы Цішкі Гартнага.
У. ДЗЯРЖЫНСКІ (Чаржынскі)—Двейнасьць З. Жылуновіча ў абсягу беларускае літаратурнае крытыкі.
А. ВАЗЬНЯСЕНСКІ—Як вытокаў творчасьці Якуба Коласа (працяг).
МАКСІМ ГАРЭЦКІ—Творчасьць маладнякоўцаў—А. Моркаўкі і Я. Ліманоўскага.
КНІГАСЬПІС:—В. ЗАЛУЦКІ, Л. ОКІНШЭВІЧ, М. КАСЬПЯРОВІЧ.
ХРОНІКА беларускае культуры; ХРОНІКА украінскага культурнага жыцьця.

ПРАДАЕЦЦА

зрыў-папера, макулатура і старыя газэты.

Адрас: Рэдакцыя газ. „Сав. Беларусь“, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса.

ЮБІЛЕЙНЫ ЗБОРНІК



Цана 65 кап. Белдзярвыдавецтва.

Менскі ЗАГС выклікае гр. Досіну Аксю Антосеву на 26 сьнежня 1928 г. па справе аб скасаваньні шлюбу з гр. Досіным Язэпам Ануфрэевым.

Вэксаль, выдадзены сельска-гаспадарчай арцельлю «Новая Жизнь», Смалявіцкага раёну, Зосі Марголінай на суму 218 рублёў і згублены ў часе разводзьдзя на Далёкім Усходзе, лічыць за нядзеючым моцы.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Кааперацыйная кніжка Гінзбург С., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 189.
— Біржавы талён Тамашова А. А., выд. Менбіржпрацы, кв. 190.
— Кааперац. кніжка Кэда Ш., выд. МЦРК, кв. 191.
— Часовая лекавая кніжка Хадасэвіча З., выд. Менакрстрахкасай кв. 192.
— Кааперац. кніжка Казелька У. С., выд. МЦРК, кв. 193.
— Лекавая кніжка Кантаровіча Л., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 194.
— Вучотна-вайсковая кніжка Баравіка К. К., выд. Нараўлянскім РВК, кв. 195.
— Конская карт. № 67127 Клімковіча Д., гр. с. Номаніцы, Барысаўскага раёну. кв. 196.
— Лекавая кніжка Кагана М. А., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 197.
— Паявая кніжка Дорфман Ф. І., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.
— Метрычн. выпісь Хадачынскага С. С., выд. Бярэзінскім РВК, кв. 198.
— Асабовая кніжка Багамаза І. І., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 198.
— Кніжка на атрыманьне пэнсіі па беспрацоўнасьці Грэк Л. Н., выд. Менакрстрахкас. кв. 200
— Купчая крэпасьць на куплены дом у Чэрвенск. Камгасе складзеную натарыўсам у 1926 г. у жэіўні м-ца на імя Матусевіча К., кв. 201.
— Сяброўская кніжка 146 Гальперынай Г. А., выд. саюзам харчавікоў, кв. 202.